Новы Час | 26 студзеня 2018 | № 2 (565) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 1

Літаратурная Беларусь

Выпуск №1 (137)
(студзень)


КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Віктар Карамазаў: «Імкнуся паказаць, як выяўляецца творчая асоба»

Адзін з вядомых пісьменнікаў пакалення шасцідзясятнікаў, Віктар Філімонавіч Карамазаў прысвяціў шэраг кніг адлюстраванню жыцця і творчасці беларускіх мастакоў: Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Станіслава Жукоўскага, Антона Бархаткова, Гаўрыіла Вашчанкі, Фердынанда Рушчыца, Анатоля Бараноўскага.



Віктар Карамазаў каля сваіх карцін

Новая — восьмая па ліку — кніга пісьменніка пра мастакоў «Пад крыжам» уключае аповесць «Зямля Фердынанда», прысвечаная Рушчыцу, навэлы «Ван Гог», «Бабіна лета», «Макі» (пра сучасных пейзажыстаў — Міколу і Марыю Ісаёнкаў, Антона Вырву), і разгорнутае апавяданне з дарагой сэрцу пісьменніка вёскай Лімень на Магілёўшчыне.

У час навагодніх святаў было прыемна ўбачыць 83-гадовага літаратара ў добрым настроі, з новымі ўражаннямі ад пабачанага вернісажа маладых мастакоў, за працай над новымі персаналіямі. Аўтар аповесцяў і эсэ, апавяданняў і нарысаў распавёў, як прыйшла да яго цікавасць да мастацкай тэмы. Здаецца, яшчэ ніхто не перадаваў так выразна словамі колеры і фарбы прыроды, за якімі назірае мастак:

«Сад атуляўся залацістай вохрай і цяплеў. Ружовыя пялёсткі макаў, яшчэ ў бутонах, былі абвешаныя кроплямі расы, у якіх таіліся зямныя ізумруды, блакітны туманок».

«Ён днямі шукаў на палатне патрэбны тон, ловячы сваё натхненне на ўзыходзе сонца, калі першая хваля святла пачынала саграваць лясныя ваколіцы, лугавую раскошу траў, абуджаючы ад начной спячкі кожную кветку, званочкі і парасончыкі, зрывала з азёрнага люстра белую начную коўдру, пасіненую ўльтрамарынавым золакам, разводзіла па бяскрайнім люстры бірузовую паводку, на якой пачынаў разгарацца дзень»…

— Аналагаў у нашай літаратуры не было, — кажа Віктар Карамазаў. — Ніводзін пісьменнік у беларускай літаратуры не напісаў пра мастакоў — хоць бы навэлу, не кажучы пра аповесць ці раман! Многія пісьменнікі сябравалі з мастакамі — і са Шчамялёвым, і з Вашчанкам, і з Савіцкім, але ніхто пра іх не пісаў. Я адчуў душу мастака, увайшоў у яго псіхалогію. Для нас вобраз мастака вельмі павучальны, гэта цэлая школа выхавання. У мастакоў кандэнсуецца высокая духоўнасць, прыгажосць музыкі чалавека і прыроды. Мастак чытае прыроду знутры. Ён раскрывае духоўны патэнцыял прыроды, і мы павінны вучыцца ў яго разуменню прыроды. Маючы немалы вопыт работы ў гэтым жанры, я ведаю, што мастакі не адкрываюцца да канца, унутраны свет іх складаны і схаваны ад вачэй. Ён увесь выліваецца ў карціну, а не ў слова. У Паўстоўскага ёсць удалыя аповесці пра Ісаака Левітана і пра Арэста Кіпрэнскага, але ён карыстаўся вядомымі фактамі. Я ж шукаю факты абсалютна невядомыя.

— Віктар Філімонавіч, нядаўна ў Магілёве адзначалася 145-годдзе з дня нараджэння Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Як Вы зацікавіліся яго творчасцю?

— Рэдактар часопіса «Нёман» Анатоль Кудравец папрасіў напісаць эсэ пра пейзажыста. Я пайшоў у архіў і знайшоў цікавыя старонкі пісьменніка Войніча, які пасля вайны збіраўся пісаць кнігу пра мастака, меў яго рукапісы. Там былі ўспаміны Бірулі пра дзяцінства. Гэтыя яго старонкі паказалі мне шлях да Бялыніцкага-Бірулі. Тады я знайшоў вёсачку Крынкі на беразе Друці, знайшоў падмурак дома бацькі, бэз пад вакном. Потым паехаў на Віцебшчыну, на возера Няшчэрда, дзе калісьці жылі бацькі Бірулі, перагледзеў работы мастака ў Нацыянальным і ў Магілёўскім музеях, захапіўся яго жыццём, і яно вывела мяне да аповесці «Крыж на зямлі і поўня ў небе». Бялыніцкі жыў у прыродзе, быў выдатным паляўнічым, і для мяне ён аказаўся не толькі творцам, а блізкім па душы і думках «лясным» чалавекам.

Аўтар аповесцяў і эсэ, апавяданняў і нарысаў распавёў, як прыйшла да яго цікавасць да мастацкай тэмы. Здаецца, яшчэ ніхто не перадаваў так выразна словамі колеры і фарбы прыроды, за якімі назірае мастак

…Раней у мяне была Лімень, вёсачка пад Чэрыкавам. У 1918–1924 гадах там знаходзілася школа-камуна, якую ўзначальваў Мадэст Лепяшынскі. Там вучыліся будучы кампазітар Ісаак Любан і прафесар Іван Гутараў. Пасля вайны ў Лімені існавала школа лесніцкаў, запаведнік баброў і вальер высакародных аленяў. Егеры вялі догляд і навуковыя даследаванні. Я прыжыўся ў лясніцтве, завёў цёплае сяброўства з леснікамі — і там у 1986 годзе напісаў раман «Пушча» і палявунічыя апавяданні. Потым туды прыйшла радыяцыя, лес і вёска аказаліся ў забруджанай зоне. Для мяне гэта была вялікая творчая страта — жыць без роднага лесу, без Лімені…

І вось тады Біруля даў мне новы шлях. Я паехаў у Цвярскую губернію і знайшоў яго знакамітае лецішча «Чайка» на высокім беразе возера Удомля. Бялыніцкі пабудаваў яго ў 1910-х гадах. Вядомае месца ў расійскай і савецкай культуры. Дом быў закінуты. Я пасяліўся там і з месяц жыў, абышоў мясціны, дзе мастак пісаў пейзажы, аб'ездзіў навакольныя вёскі. Насупраць «Чайкі» ёсць вёска Гарусава, дзе жыў Ісаак Левітан, пісаў эцюды да сваёй вялікай карціны «Над вечным спакоем». Там у 90-х гадах XIX стагоддзя ён стварыў «Залатую восень». Тут адбыўся ўзлёт творчасці жывапісца.

Бялыніцкі любіў і глыбока ведаў прыроду. Мне прыемна было пісаць пра яго аповесць. Яна публікавалася ў «Маладосці», пасля выйшла асобнай кнігай. Мы наладзілі ў 1996 годзе першы пленэр Бялыніцкага-Бірулі. З таго часу яны ладзяцца кожны год…

Пазней я напісаў сцэнар для кінафільма па аповесці, і рэжысёр Валерый Басаў паставіў поўнаметражны кінафільм, які так і называўся: «Крыж на зямлі і поўня ў небе». Валянцін Ермаловіч, які працаваў у Магілёве рэжысёрам гарадскога тэатра, па аповесці паставіў спектакль. Прэм'ера ўрачыста адбылася ў музеі Бялыніцкага-Бірулі. Ермаловіч іграў Бірулю. Аповесць была ўключана ў школьныя праграмы… Усё гэта — светлая старонка майго жыцця.

Напісаўшы аповесць пра Бялыніцкага-Бірулю, я зацікавіўся творчасцю яго сябра — Станіслава Жукоўскага з Пружанаў. 70 гадоў яго выставы не ладзілі ў Савецкім Саюзе, ён быў пад забаронаю, бо яго бацька і дзядзькі былі рэпрэсаваныя. З 1923 года Жукоўскі жыў у Польшчы. Мая аповесць «Брат мой духоўны» паспрыяла яго рэабілітацыі. Тады і адбылася яго першая выстава. У нашым Нацыянальным музеі ёсць каля 30 яго работ. Мне дапамог маскоўскі мастацтвазнаўца Гарэлы.

А потым я пісаў пра Антона Бархаткова, які лічыў сябе вучнем Бірулі…

— Вы таксама пішаце карціны?

— Гэта маё вельмі ранняе і на ўсё жыццё захапленне. Пасля вайны партрэтаў пісьменнікаў у школе не было, падручнікі меў мала хто, а я браў кнігі ў бібліятэцы крычаўскага педвучылішча, дзе бацька выкладаў літаратуру і мову. Там знаходзіў партрэты класікаў, перамалёўваў іх на левым чыстым баку плакатаў, якія давала настаўніца, прыносіў у школу.

Працяг на стар. 10 (4) »

Новы сезон Прэміі Цёткі

Распачынаецца трэці сезон Прэміі Цёткі (Алаізы Пашкевіч), якая прысуджаецца за найлепшую кнігу для дзяцей і падлеткаў. На конкурс прымаюцца кнігі 2017 года, напісаныя на беларускай мове.

Прэмія Цёткі ўручаецца ў дзвюх намінацыях: за найлепшы твор для дзяцей і падлеткаў (незалежна ад роду літаратуры: проза, паэзія, драматургія — аўтару арыгінальнай беларускай кнігі) і за найлепшае мастацкае афармленне кнігі (мастаку-ілюстратару кнігі). Для кожнай намінацыі асобнае журы вызначыць аднаго пераможцу. Кожны з іх атрымае грашовы прыз, эквівалентны 2000 даляраў ЗША.

Каб падаць кнігу на разгляд, трэба запоўніць форму на сайце ciotka.by. Прапанаваць кнігу на конкурс могуць выдавецтвы, члены журы, аргкамітэт прэміі, а таксама сам аўтар або мастак і наогул любы зацікаўлены чытач.

У 2016 годзе пераможцамі першай Прэміі Цёткі сталі пісьменніца Надзея Ясмінска і мастачка Кацярына Дубовік з кнігай «Сем ружаў». У 2017 — Уладзімір Арлоў і Павел Татарнікаў з кнігай «Айчына: маляўнічая гісторыя. Ад Рагнеды да Касцюшкі».

Кніга Валянціны Аксак

«Завінены рай» — сёмая кніга Валянціны Аксак (ад пачатку 1990-х выйшлі «Цвінтар», «Капліца», «Антычны дождж», «Віно з Каліфорніі», «Ружоўніца» і «Дзікая сліва»).



Нават не чытаўшы вершаў Валянціны Аксак, па адных назвах можна зразумець: гэта паэзія па-за часам. Яна «будуецца» на архетыпах, без якіх няма чалавека і яго культуры.

На тое ў часе прэзентацыі звярнуў увагу Ціхан Чарнякевіч. Тонкі водар нечага невымоўнага — так ён ахарактарызаваў паэзію Валянціны Аксак, у тым ліку «Завінены рай». Але асабліва засяродзіў увагу на «Антычным дажджы».

– Кніга выйшла ў дзевяностыя — страшны час. «Антычны дождж» быў як вакно ў іншы свет, каранёвы, анталагічны. Гэтая антычнасць засталася ценем, які праходзіць праз кожную кнігу Валянціны Аксак, такім нетаропкім верлібрам... Тут шмат прыроды, але не такой, як на дзіцячых малюнках — дрэва й два сукі. Гэта сусветнае дрэва, і паэзія — частка прыроды.

А пачаўся вечар проста — з чытання вершаў. «Добры вечар, мая дарагая...» — першае, што пачулі гледачы ад Валянціны Аксак.

Агульнае ўражанне пасля чытанняў: «Завінены рай» — працяг «Дзікай слівы». Але з біблійным ухілам (напрыклад, вершы «І мы тут былі», «Поўня»). Новая кніга змяшчае цыклы вершаў, якія, па азначэнні аўтаркі, умоўна можна назваць хрысціянскімі.

Што цікава, хрысціянства ў Валянціны Аксак «некананічнае». Гэта не погляд раба божага на высокія ід(э)алы, але погляд чалавека, роўнага боскаму. Вельмі займальна назіраць, як гераіня/аўтарка прымярае даўнішнія біблійныя сюжэты на сучаснасць, вядзе паралельна лініі рэлігійнага канону і паўсядзённасці чалавека.

Пры гэтым, як і раней, аўтарка — уся ў сабе, і ў сабе ж знаходзіць увесь свет. Захаваліся матывы адзіноты і «адцвітання», такія сабе прымаразкі, сутонне, пераходныя плыткія станы. У такіх варунках чытач — чыстая фармальнасць: кніга і так завершаная.

Запрашаючы на вечар, інфапляцоўкі паведамлялі: у кнізе «старасвецкія нетры мовы і немінучая вусціш бязмоўя». Што да «нетраў», тут, відаць, найперш маецца на ўвазе дзівосныя назвы раслінак, якія ведаюць сёння адзінкі аматараў-садаводаў. Заўважыла гэтую рысу рэдактарка Аляксандра Макавік, якую аўтарка кнігі лічыць бездакорным спецыялістам.

— Творчасць Валянціны Аксак — гэта кніжны сад... Сад — ён яшчэ і райскі, такі канцэнтраваны вобраз. Але ў пані Валянціны сад не столькі райскі, колькі Гефсіманскі. У ім ёсць яшчэ права выбару, у ім ёсць віна і магчымасць даравання.

У працяг выдавецкай тэмы слова мелі выдавец Зміцер Вішнёў («Галіяфы») і мастак Генадзь Мацур. Зміцер падзівіўся свайму шанцаванню: у працы з кнігай не трэба было шукаць ні мастака, ні рэдактара...

Што да мастацтва, Валянціна Аксак прызналася: Генадзь Мацур так на яе паўплываў сваім бачаннем кнігі, што яна адмыслова для прэзентацыі знайшла сукенку, да кнігі падобную.


– Дзе чалавек сапраўдны — у жыцці ці ў творчасці? Я разважаю над гэтым, пакуль для сябе не вырашыў: у творчасці. Чытайце кнігу пані Валянціны — там і ёсць сапраўдны чалавек, — падсумаваў спадар Генадзь.

Таксама з нараджэннем кнігі аўтарку віншавалі старшыня ПЭН-цэнтра Таццяна Нядбай, настаўніца і «лепшая мая чытачка» (В.Аксак) Наталля Плакса. Музычную аздобу вечара забяспечыла Таццяна Грыневіч.

Тэкст і фота: Наста Грышчук

Як сказаць праўду і застацца жывым?

(Праблемы сучаснай крытыкі)



Дыскусія літаратурных крытыкаў новай генерацыі адбылася ў Літаратурным музеі імя Максіма Багдановіча. Удзел у размове прынялі Марына Весялуха, Наста Грышчук, Жанна Капуста і Алена Карп. Мадэраваў сустрэчу Ціхан Чарнякевіч.

Разам яны паспрабавалі разабрацца, чаму сучасная літаратурная крытыка незаўважная ў Беларусі і як палепшыць сітуацыю. Сустрэча была арганізаваная Саюзам беларускіх пісьменнікаў. Вашай увазе — асноўныя тэзісы дыскусіі.

З якімі праблемамі на сённяшні дзень сутыкаецца беларуская крытыка?

- звужэнне чытацкай аўдыторыі;
- адсутнасць адзінага парталу пра літаратуру, дзе можна было б рэгулярна размяшчаць крытычныя матэрыялы;
- адсутнасць магчымасці друкаваць рэйтынгі кніг на інтэрнэт-платформах: ва ўсіх СМІ свой фармат, свая іерархія, не кожнае пагаджаецца друкаваць навіны пра літаратуру. У буйных выданнях знікаюць рубрыкі, прысвечаныя культуры. Прыкладам, на інфармацыйным партале TUT.BY рубрыку «Культура» замянілі на рубрыку «Кругагляд». Рэдактары парталаў, у сваю чаргу, скардзяцца, што матэрыялы пра літаратуру маюць нізкія рэйтынгі, таму аддаюць перавагу артыкулам на іншую тэматыку;
- пасіўнасць выдаўцоў, якія, з аднага боку, зацікаўленыя, каб пра іх кнігі пісалі, але пры гэтым не кантактуюць з крытыкамі на пастаяннай аснове;
- замкнёнасць рэкламы беларускіх выданняў на фэйсбуку (нярэдка ў навязлівай форме ў выглядзе каментароў да прыватных допісаў), на вузкім коле чытачоў-знаёмых, якія і так сочаць за навінкамі ў літаратуры;
- адсутнасць кніжных менеджараў, кніжных скаўтаў, валанцёраў, піяршчыкаў, папулярных кніжных відэа-блогераў. У выніку ад крытыкаў патрабуецца выкананне дзясяткаў функцый, што можа адмоўна адбівацца на якасці матэрыялаў;
- нізкі статус крытыка нават у сваёй сферы дзейнасці;
- адсутнасць паўнавартаснай аплаты працы ў літаратурнай крытыцы (з гэтай прычыны большасць крытыкаў рана ці позна сыходзіць у нелітаратурныя прафесіі);

У чым бачаць сваю функцыю сучасныя аўтары крытыкі?

Наста Грышчук: Ад нас чакаюць, што мы скажам, што ў кнізе не так, але, пры гэтым, адначасова больш са станоўчай адзнакай, каб і «прасунуць» кнігу. Крытыкаваць нельга — трэба рабіць зніжку на сітуацыю. Але ж у ідэале, калі разбіраеш тэкст, да ўсяго трэба падыходзіць аб'ектыўна. Калі крытыкі будуць рабіць аўтарам зніжкі, нічога добрага не атрымаецца.

Жанна Капуста: Мы рэагуем на літаратурны працэс, паказваем, што ён ёсць, жыве. Выходзяць кнігі — і мы на іх адгукаемся, яны не знікаюць недзе ў бездані...

Марына Весялуха: Функцыя залежыць ад таго, куды я пішу. Калі ў «Звязду» — мне важна напісаць, што за кніга выйшла, каму яна можа быць цікавая — нейтральны тэкст, каб чытач у рэгіёнах пабачыў, што ёсць такі аўтар. Калі пішу на «Радыё Свабода» — магу сабе дазволіць іронію, пакпіць з аўтара, выбраць цікавую форму.

Алена Карп: Думаю, рэклама ўзнікае як пабочны эфект — нейкі сімвалічны капітал аўтару «капае», калі пра яго напісаў крытык, які таксама мае з гэтага свой сімвалічны капітал. Але рэкламай павінны займацца прафесіяналы. Мне здаецца, у нас ёсць «магія імя» — імя, якое аднойчы прагучала і пасля будзе доўгі час узгадвацца. Сама кніга можа не чытацца, але мы будзем па-інерцыі казаць, што пісьменнік цудоўны, і запісваць у рэйтынгі. Мне ж звычайна хочацца расказаць пра кнігу, пра якую наўрад ці хто-небудзь напіша.

Ці павышаюць цікавасць да літаратуры літаратурныя прэміі і рэйтынгі?

Прэміі, у тым ліку і прэмія Гедройца, усё адно гучаць у вузкім коле, папулярызацыі літаратуры не спрыяюць, але ўсе — і пісьменнікі, і крытыкі, робяць выгляд, што гэта нармальна. На жаль, спынена практыка крытычнага агляду шорт-ліста прэміі Гедройца. Пры гэтым вышэйназваная прэмія стварае экспертнае поле, дзе выбіраюцца найлепшыя творы з сучаснай беларускай літаратуры. Такім чынам меркаванне журы замяняе сабой крытычную экспертызу.

Рэйтынгі, кшталту найлепшыя кнігі года па версіі Радыё Свабода, таксама паказальныя. Прыкладам, відавочна, што ў 2017 годзе пераклады зацьмілі сабой і прозу, і паэзію: літаратурныя эксперты сярод найлепшых кніг называлі выданні 2016 года.

Што трэба рабіць, каб змяніць сітуацыю?

Жанна Капуста: Пісаць пра кнігі, працаваць, і тады будзе рэха і водгук. Калі мы перастанем крытыкаваць — гэта будзе азначаць, што нам самім не цікава. Думаю, бяда наша ў тым, што мы замыкаемся ў нашым коле. Трэба хадзіць «у людзі», а мы, наадварот, заўсёды збіраемся самі з сабой. Ад таго і наклад кніг падае, і краўдфандынг нагадвае адчайны крык.

Алена Карп: Трэба павышаць узровень. Я вельмі далёкая ад таго, каб плакаць — наш чытач неразумны, давайце мы яму напішам як мага прасцей: «Топ-5 вясёлых кніг», «Топ-5 спектакляў, на якія трэба звадзіць дзяўчыну» і інш. Гэта шлях у нікуды. Мы не мусім гэтым займацца. Я за тое, каб была разумная крытыка. Калі людзі любяць чытаць — яны ўжо дастакова развітыя, каб прачытаць сур'ёзную рэцэнзію на беларускай мове.

Наста Грышчук: Калі «адмесці» рэкламу, крытык — чалавек, які павінны пастаянна самаадукоўвацца і расці, бо калі ты спынішся — ты выпадаеш. І гэта праблема. Павінны быць нейкі пастаянны заробак канкрэтна з гэтай справы, на які можна існаваць. Калі ты матэрыяльна забяспечаны — ёсць вольны час чытаць тое, што хочаш, вывучаць вопыт замежных калег, самаадукоўвацца і паралельна пісаць. І каб на цябе пры гэтым не ціснулі: «Давай прыбяром вось гэта». Калі такія ўмовы праіснуюць нейкі працяглы час — крытыкі будуць самі па сабе расці, з'явіцца база для будучыні.

Марына Весялуха: У беларускай літаратуры да крытыкаў дзве прэтэнзіі: па-першае, вас няма, па-другое, вы павінны адказваць за папулярызацыю беларускай літаратуры. То бок атрымліваецца, што гэта нікому не патрэбна — толькі нам самім, такое выходзіць альтруістычнае хобі. Так, я сапраўды вельмі сумую, калі не пішу, вельмі хочацца чытаць і распавядаць свае ўражанні ад кніг. Але адны мы нічога не зробім, патрэбная дапамога звонку, разуменне выдаўцоў у першую чаргу.

Напрыканцы ўдзельнікі дыскусіі пагадзіліся на тым, што патрэбнае павышэнне аўтарытэту і статуса крытыкі. Магчыма, гэта адбудзецца праз інстытуцыялізацыю крытыкі ці заснаванне адмысловага крытычнага інтэрнэт-парталу.

Аляксандра Дварэцкая

Арыядніна ніць

Адзе

Ада, Арыяда, Арыядна!
Мне б цябе і любіць, і сніць,
Толькі дзе, скажы, Арыядна,
Арыядніна твая ніць?

Я брыду лабірынтам жыццёвым.
Колькі цёмных у ім хадоў!
Я гатовы ісці самым цёмным,
Я схапіцца з пачварай гатоў.

Толькі дай мне ўсмешку светлую —
Хто яшчэ мяне можа натхніць! —
Толькі дай мне сваю запаветную,
Пуцяводную сваю ніць.

Без яе не герой я — ахвяра,
Не змагар я, а раб без яе.
А яе нам дае толькі мара
Ды любоў яе нам дае.

1965



На беразе Дняпра. Год жаніцьбы. 1960



Чарговы ўрок літаратуры. 1974

Пла́чу…

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

Светлай памяці жонкі
Ады Вярцінскай (Жураўлёвай)

***

Не столькі пішу
ў сэнсе звычайным,
колькі запісваю, зазначаю.
Нехта мяне шкадуе, ратуе,
радкі вось гэтыя дыктуе.
Анёл-ахоўнік ці нехта іншы?
А можа быць, і сам Усявышні?
Святы, магутны, несмяротны,
ён разумее мой стан гаротны,
спрыяе адольваць нядолю-няўдачу.
Пла́чу…
Мне мудра ра́дзіць, чула тлумачыць.
Плачу…
Адорвае ласкай сваёй, не іначай.
Плачу…





З двухгадовым сынам Яўгенам. 1962.

***

…Сэрцайка біцца перастала.
Спынілася ўраз. І Яе не стала.
Не стала на золаку
асеннім, імглістым,
На свеце гэтым,
жывым, існым.
На золаку зорка яе пагасла,
якая штораз узыходзіла ясна,
ззяла, свяціла, святло пасылала,
Яе пуцявіну асвятляла.
А́дачка, матачка, жоначка,
не ззяе, згасла твая зорачка!
Адмучылася ты, адпакутвала.
Не шкадавала хворасць лютая.
Бязлітасна справу сваю рабіла.
Спыніла сэрцайка, загубіла…

***

Апошні шлях. Дарога незваротная.
Апошняе «бывай».
Так, мы — смяротныя.
Апошняе «даруй».
Так, мы — часовыя,
Не дораць нам, на жаль,
жыццё другое, новае.
А дадзенае нам напамінае
цень, што працягу, ведама, не мае.
Гаворым безнадзейна пра «апошняе».
Ды застаецца ўсё ж спадзеў на Божае,
спадзеў на вечнае,
на душы нашыя,
што не часовыя — інакшыя.

***

Адачка, матачка, матка!
Прыціхла нашая хатка.
Нячутна ў цішы яе гораснай
крокаў тваіх, твайго голасу.
Там і гэтак жа месцідца
тваё любімае крэсліца.
Ды, бачу, перажывае,
няўтульна сябе адчувае.
Бядуе, сумуе хатка,
твае абутак, апратка,
тваё ўсё тужліва стыне,
чакае: дзе ж гаспадыня?

***

Раюць трымацца, не адчайвацца.
Кажуць, маўляў, жыццё прадаўжаецца.
Ну так, ідзе яно, прадаўжаецца,
Хаця скананнямі і суправаджаецца.
Ды з кім прадаўжаецца, як, якім чынам?
Як немагчымаму стацца магчымым?..
Толькі ўжо ў снах жывой Яе бачу.
Плачу…
Сябе дакараю, вінавачу.
Плачу…
Не знаю, далей як з лёсам зладжу.
Плачу…

Снежань 2017 г.



З унукам Янкам. Юрмала. 1991

«Імкнуся паказаць, як выяўляецца творчая асоба»

« Заканчэнне. Пачатак на стар. 7 (1)

Настаўніца прышпільвала партрэт да класнай дошкі і вяла ўрок. Бацька ўбачыў маё захапленне і выпісаў з Масквы цэлую скрынку алейных фарбаў у тубах. Я пачаў капіраваць карціны Левітана, Шышкіна, савецкіх мастакоў. А першы малюнак зрабіў алоўкам яшчэ зімою сорак першага года на ваенным заводзе пад Ульянаўскам.

Як там апынуўся? Мы патрапілі пад бамбёжку, я згубіўся, і бацька мяне знайшоў на ваенным заводзе, дзе рабілі снарады і міны. Я патрапіў у інтэрнат для беспрытульных дзяцей. Нас апраналі ў салдацкія неданоскі і кармілі... Маю першую значную жывапісную работу з натуры «Зазімак» я напісаў на першым пленэры Бялыніцкага-Бірулі ў 1997 годзе.

— Аднак вучыцца Вы пайшлі не ў мастацкую вучэльню, а на факультэт журналістыкі БДУ?

— Вучыцца тады пасля вайны ў мастацкай школе не было матэрыяльнай магчымасці. І ў 1953 годзе я паступіў у БДУ. На апошніх курсах ужо пісаў апавяданні. У 1958 годзе па заканчэнні ўніверсітэта я паехаў на раён і гадоў пяць працаваў у чэрыкаўскай раённай газеце, а ў 1964 годзе вярнуўся ў Мінск. Першую кніжку апавяданняў «Падранак» я напісаў менавіта ў Лімені.

— Віктар Філімонавіч, а як Вы пазнаёміліся з Вашай будучай жонкай Лідзіяй Мікалаеўнай?

— Мы вучыліся разам з ёй ва ўніверсітэце. Я заканчваў журфак, а яна — аддзяленне беларускай мовы і літаратуры... Наш сын Сяргей закончыў політэхнічны інстытут, а дачка Люміла выкладае ў гімназіі беларускую мову і літаратуру. Кожны год яна са сваімі вучнямі займае першыя месцы на алімпіядах.

— У Вашу новую кнігу «Пад крыжам» увайшла аповесць «Зямля Фердынанда» пра нашага выдатнага мастака Рушчыца. Як Вы яе пісалі?

— Цяжка пісаць пра мастакоў, якія жылі і памерлі, таму што ў нас няма архіваў. Але мне не патрэбная ўся біяграфія мастака. Мне трэба быць моцна ўражаным яго творчым, духоўным подзвігам або яго трагедыяй, ёю запаліцца, у яе ўвайсці і яе разгадаць, маючы ўсяго некалькі фактаў з жыцця, але такіх, якія даюць лагічную і дастатковую прастору для псіхалагічнага мастацкага аналізу. Гэтакая праца патрабуе ад мяне майго ўласнага жыццёвага вопыту не менш, як жыццёвага вопыту літаратурнага героя. Так. І гэта, падкрэслю, не ёсць выдуманая праўда. Пад ёй грунт больш моцны, як пад нейкім адным асобным біяграфічным і гістарычным фактам. Трэба выпрацаваць пэўны стыль і метад. Мне гэта, думаю, пакуль што ўдаецца.

У сваёй аповесці пра Рушчыца я даследаваў праблему адрыву мастака ад родных каранёў, спрабаваў спасцігнуць, чаму Рушчыц назаўсёды пакінуў палітру і пэндзл і пераключыўся на выкладчыцкую дзейнасць. Я зразумеў гэтую драму і даў адказ у аповесці. Мастак павінен трымацца свайго асяроддзя, сваёй глебы, сваіх традыцый, школы. Як толькі ён пачынае мяняць іх, то губляе сваю непаўторнасць.

...Я сябраваў з народным мастаком Анатолем Барановскім, бываў з ім на пленэрах, бачыў, як ён піша ў майстэрні, мы шчыра пра ўсё гаварылі. Гэта быў выдатны чалавек, выкладчык Беларускай акадэміі мастацтваў. Ён увесь час мяняўся, шукаў новае святло, ішоў да свайго ідэалу. Цяпер мне яго вельмі не стае.

Мяне апошнім часам захапілі маладыя мастакі рэалістычнай школы, якія выставілі свае творы ў галерэі Міхаіла Савіцкага: Антон Вырва, Васіль Пешкун, Уладыслаў Пятручык, і я пішу нататкі пра іх творчасць. Я з імі шчыры. Новая кніга адкрываецца навэлай «Ван Гог», у ёй аповед ідзе пра Антона Вырву. Часам я адыходзіў ад даставерначасці, але мастак прыняў маю навэлу. «Маё» і «яго» арганічна зліта. У гэтым мне дапамагае мой жывапіс.

— Некалькі Вашых кніг маюць сімвал крыжа. Ён у назве першай кнігі пра Бялыніцкага-Бірулю, і ў назве новай кнігі, у тэксце апавядання, якое ве вянчае.

— Так. Не выпадкова. Крыж сваіх пакут як крыж свайго подзвігу для людзей, іх ратунку, Ісус Хрыстос нёс на плячах на сваю Галгофу і там праклаў шлях кожнаму хрысціяніну, кожнаму з нас, у тым ліку і маім літаратурным героям.

Гутарыла Эла Дзвінская,
фота аўтара

Калі абдымае Вікторыя

З любоўю пра Іллю

Жарсць шукання

Вы калі-небудзь аддзіралі мох у лесе, каб знайсці пад ім жалеза? Хутчэй за ўсё, адказ будзе адмоўны. Які мох! Якое жалеза! Хіба што ў тым моху пабачыць сонечную ліску і наладаваць свой кошык смакатой. Але ж яшчэ толькі пачатак траўня.

А я шукала жалеза, амаль як золата, бо калі ты шукаеш — жарсць шукання гэтак апаноўвае, што яшчэ болей усведамляеш: не ўсё тое золата, што зіхаціць. Вядома ж, у мяне былі хаўруснікі-жалезашукальнікі: найгалоўны пісьменнік-краязнаўца Іллі Уладзімір Кажамяка і такі самы, як я, апантаны, муж, гісторык і музыка Яраш Малішэўскі.

У жалезны лес Уладзімір Кажамяка завёў нас пасля выступаў у Іллянскай школе і аграрным каледжы. Жалезны лес — не ўвесь гэткі, але краязнавец ведае мясціну, дзе колькі стагоддзяў таму перакуліўся воз, што вёз выплаўленае з руды жалеза. Атрымаўшы шчасце патрымаць у руках тое, што шукалі, далей вандруем Іллёю і ваколіцамі.

На могілках

Адведваем магілу акадэміка Адама Грымаця, чыё імя носіць Іллянская школа. Сярод магіл на старым камлі ўзвышаецца буслянка. У ім бусел і бусліха. Буслы гняздуюць бліжэй да людзей. Значыцца, і на могілках адчуваюць чалавечую прысутнасць. З вышыні назіраюць за светам тым і гэтым.

«Я кропля вялікага творчага мора»

Кветкі, якія дораць на выступах, даўно не пакідаю сабе. Пастанавіла вяртаць іх тым, без каго б не было мяне-пісьменніцы. У Іллі — гэта Змітрок Бядуля, які ў 1899–1901 гадах навучаўся ў старажытным мястэчку.

Ля школы камень з шыльдай у гонар класіка беларускай літаратуры. І ягоны радок акурат блізкі маёй традыцыі: «Я кропля вялікага творчага мора».

Ускладаю кветкі сонечныя-сонечныя, а ў назве іхняй ёсць тое, што таксама ўласціва творцам — нарцыс.

Сузор'і на калонах

На велічных драўляных калонах — сузор'і з дзірачак-зорачак. Нехта скажа: «Не выдумляй! Шашаль патачыў.» Але ж я каля царквы прарока Іллі.

Паводле адной з версій само мястэчка Ілля атрымала назву ад Іллінскай царквы. І гэтая нябёсная версія ўзвышае і саміх іллянцаў, і вандроўнікаў-гасцей.

Свята Іллі ў Іллі

Ці больш дажджоў і граду ў Іллі, ці меней, чым у іншых мясцінах Беларусі, не ведаю. Любуюся мястэчкам у дзень з пераменлівай воблачнасцю. Мо і добра, што Ілля не грукацiць на калясніцы і не кідае стрэлы-маланкі ў нячысцікаў. Казалі, што тыя могуць ператварацца ў розных звяроў, хавацца ў хатах. Хаты ў Іллі прыгожыя...

Свята Іллі ў Іллі — 2 жніўня. Маланкі ў гэтае свята ўважаліся за лекавыя, а дажджавую ваду таго дня збіралі, каб мыцца ёю.

Вось і ўяўляю, што калі ў гэты дзень маланкі і дождж у Іллі — дык яны надзвычай цудадзейныя. І як файна хадзіць басанож іллянскімі калюгамі!

Паўстанцкае

Падыходзім да месца, дзе ў 1930 годзе была збудаваная капліца, прысвечаная героям паўстання 1863 года. Капліцу знішчылі за Саветамі. На гэтым месцы маладая травеньская трава, якая нібыта шапочка: «Капліца вернецца».

Пасля задушэння паўстання 1863 года, як і ў многіх іншых мясцінах Беларусі, каталіцкая бажніца Святога Міхала была пераўтвораная ў царкву. Гэтак сталася, што царквы ў Іллі было дзве, а касцёла пэўны час — ніводнага.

Звязанае мястэчка Ілля і з паўстаннем Тадэвуша Касцюшкі. Менавіта за ўдзел у ім уладальніка мястэчка Міхала Клеафаса Агінскага яно і было канфіскаванае расейскімі ўладамі. Тое самае — рабаванне-канфіскаванне адбылося з іншым уладальнікам — Станіславам Радзішэўскім пасля паўстання 1830–31 гадоў. Лёс Іллі — як лёс Беларусі...



Арышт На Камяні

Бажніца Святога Міхала за Польшчай была вернутая каталікам і пераасвечаная ў касцёл Маці Божай Ружанцовай. Яго спалілі ў Другую сусветную вайну.

Але застаўся касцёл Найсвяцейшага Пана Езуса, які ўпрыгожвае мястэчка. Углядаюся ў ягоныя незвычайныя камяні. Нібыта і ўсе камяні ў Беларусі для мяне незвычайныя, але з гэтымі знітаваная свая гісторыя.

Пабудову касцёла ў значнай ступені фундаваў пан Тукала. Ён плаціў сваім сялянам за прывезенае каменне. І вось каталікі пачалі збіраць малыя і вялікія камяні на царкоўным полі.

Угневаны праваслаўны святар прасіў мясцовага ўрадніка скласці пратакол і накласці арышт на камяні. Але той гэтага не ўчыніў, а калі скарга дайшла да вялейскага ўрадніка, каменне ўжо звезлі з поля. Тутэйшы ўраднік атрымаў вымову. Але што такое вымова ў параўнанні са спрыяннем будавання святыні!

М. К.

Не адно сярод касцёлаў, але і сярод цэркваў ёсць у Іллі страчаная спадчына. Пра гэта кажа і невялікая шыльда, якая стаіць на доле: «На гэтым месцы ў 1938 годзе была пабудаваная Свята-Іосіфаўская царква святаром Віктарам Бекарэвічам. У 50-я гады царква была разбураная».

Побач з ёю вялікі камень у гонар самога мястэчка «Ілля 1473». І вершаваныя радкі:

Праз віхуры нялёгкіх гадоў,
Мы ідзём пераможна і годна,
І свой край, край палёў і садоў,
Называем Ільяншчынай горда.

Ёсць куточак вілейскай зямлі,
Ілья ёсць назаўжды дарагая.
Мы жывём тут, дзе продкі жылі,
І пра гэта — у песнях спяваем.

Уразіў подпіс: «М. К.». Мясцовы аўтар сціпла паставіў толькі ініцыялы. Хацела напісаць, што не памятаю, як яго завуць. Ды ўсё ж пастанавіла, што сціпласць вартая расшыфравання — і ўдакладніла: Мікола Кутас.

Вікторыя

Наездзіўшыся і нашпацыраваўшыся, вяртаемся да школы, у якой выступалі. Каб развітацца з Уладзімірам Кажамякам і з'ехаць. І раптам да мяне падбягае дзяўчынка і запытваецца: «Ці можна Вас абняць?» Вядома ж, можна. Гэтак мяне абдымае Вікторыя. Вікторыя Васінкевіч з 8 «Б» класа. І спадар Уладзімір усхваляваны яшчэ болей за мяне. Бо ён гэтулькі апавядаў пра школу...

Крылы жаданняў

Школа ў Іллі з рэдкім ухілам — краязнаўчым. І адна з рэдкіх школ, у якіх не адзін музей, а два: краязнаўчы і «Вілейшчына літаратурная».

Аўтографы і кнігі, прасы і калаўроты, посцілкі тканыя і ручнікі вышываныя. Там можна пабачыць і вялізную тэчку, на якой залатымі літарамі напісана: «Дзяржаўны АКТ на вечнае карыстанне зямлёй калгасамі», і велізарны куфар, з якім ягоны гаспадар паехаў у Амерыку. І з ім жа вярнуўся.


А яшчэ можна пакруціць крылы ветрака, якія праўдзіць жаданні.

Сапраўды праўдзіць.

Аксана Спрынчан

набытак губляецца ў глыбіню

Квантэмы



Алесь РАЗАНАЎ

У мінулым годзе чытачы «навачаснай» «Літаратурнай Беларусі» мелі магчымасць адчуць паэтычную загадкавасць і слоўную электрычнасць твораў Алеся Разанава. Паўторым жа за аўтарам — чакаючы выхаду ягонай новай кнігі — і ў наступны раз:

«Квантэмы — немагчымыя вершы: іхняя граматыка алхімія, іхняя логіка здагадка, яны выклікаюць з утоеных абсягаў быццё зместы, што не выяўляюцца, а ёсць.

Словы ў іх дзейныя асобы, і, кажучы пра нешта, што ім вядома, усякі раз адкрываюць тое, што не мае ні вобразу, ні наймення, — н і ш т о, але гэтае нешта істотнае».

*
збягаюцца сцежкі
сабе зацяжкі
набытак
губляецца ў глыбіню

*
спадсподу дно
гадае гаспадыня
дзіравы плот
дзе спраўдзіцца адно

*
ломяцца мыліцы
хмары ў памылцы
малюе
полымя храм

*
абуты ў бахілы
у хібах чын
выбух
выхоплівае глыбачыню

*
падзелены на пастаці
дзе людзі
адсоткі сочаць
лусты на стале

*
дровы адорваюць
дарагое
знаходзіць агонь
уводзіць
дарога з двара
унутр

*
вяду адымаючыся
адбіткі
здабыткі
свет справядлівы
адлівы ўслед

*
кудою ў потым
згадка падае
руку з-за плота
ў кайданах натоўпы

*
аднесены ў даўняе
адпавядаю
долу і небу
падае снег

*
галіна згінаецца
наўзахоп
зямное за мною
за пазухай вагі

*
сонца ў праменні
чмялі пасланцы
перамены
вылічваюць
хто ёсць чым

*
празрыстая рыса
прысак
знікае і паўстае

*
пні супыняюцца
сонца
сніцца суніцамі
ніцма плынь

*
стасуюцца
у калоду
ўкладаюцца соты
адкульсьці стод

*
цэлае цела
мураш
зварушвае цалі
у пальцах мера

*
у збегах рогі
ў гонар
берагуць
дагэтуль берагі
ў рабоце спробы

*
са дна ў віднату
натую
даты ў дадатак
ў вынятак сад

*
на месцы трон
вяртаюся старонні
з адмецінамі
ростань навырост


*
ловы рассоўваюцца
усцяж
кажуцца словы
ўцякае сцежка

*
спакуса ўпускаецца
дуля
адтуль
смакуе
дотык аса

*
пакліканы некалі
ў клінапіс
засяляюць
высілкі высачыню

*
здагадка прачынаецца
да рук
ідзе дарунак
недакурак нейчы

*
збіраю рублі
зарабляю
з паветра
зруб
апу-
скаецца
напавер



*
ратуе перамена
унутры
вартуецца парог
у тварах нетры

*
дакуль перакульваюцца
наваколле
нашча
улашчваецца ў гладышы

*
малюнкі мне
мінулае лунае
ў акне адзінкі
месяц без нуля

*
табою пакінуты
у акіян
кіт адплывае
абое квіты

*
полымя моліцца
у чысціню
у прычасці
постаць чыясьці

*
з іскрыны слова
латае старое
карысць нанова
ў скрыні палатно

*
тасуюцца стасункі
наўздагон
вагон вагае
у сутыку суткі

*
адзенне недзе
год узнагарода
дзе я
дзе ты
знаходзіць карагод

*
цела ці лёс
цаляюць
стрэлы кудысьці
куды ісці

*
ломяцца долы
ў палоне
лона
адтульвае глыбіня

*
доўгія ўрокі
у гуру
дождж
гутарыць з агуркамі

*
знадворку ўнаадварот
вандроўка
дрот голы
ластаўкі застаюцца
над галавой

*
вяртаюцца варагі
раўнавага
трымае чару
гаварку з чаргой

*
дарэшты
з сябе
насенне
сніць небяспеку
з рэшата снег

*
веру не рвецца
ўгары вяроўцы
ў равах
зеўраць звяры
на заўтра

*
вялікі
адтульваюць спакваля
калівы
куль аднекуль

*
дуб да нябёсаў
у будане
дабуду ў сабе
да буды

*
валодае вада
адволі да
адольваецца дол
далёка лодка

*
з сякераю наўскасяк
не так і не сяк
кіруюся з лесу
кесар калісьці

*
уселены ў словы
зычыць
звычай хлеб соль
смыліць

*
трывога ўгаворваецца
іду
да ворага з торгу

*
вокны ў спатканнях
з досвітку
у змярканне
конадні ткуцца
коні наўскапыта

*
у вокліку грак
рака
ўвалоквае ўпотайкі
наваколле

*
празрыстае ў рызах
у шкло
ўзіраюцца кшталты
шукаю школу

*
узоры малююць
з-за плямы замала
мяне ў палымянае
розум скрозь

*
арыштаваны
у рыштаванні
гартаю
у кляштары каляндар

*
рупіць наступнасць
пільнуе
шкарупа
парушаную пустату

*
раптоўна натрапіцца
спрат
яшчэ
яшчарка прыткая
ў паратунак

*
шкадуе перашкода
да мяжы
мажлівы сам
адгэтуль велікодны

*
старая хата
раюся з аратым
хто застаецца
страхі з-пад страхі

*
часовы частковы
высачыня
адсочвае сцежкі
ўваходжу ў сховы

*
імёны ўзаеміны
называю
даніну
зыймаю
з нямой даўніны

*
сякера пад лаваю
у кавалкі
параза акрэслівае
разы

*
ні дыму
змагла
ні агню
імгла
здымаюцца з колераў
акуляры

*
з ролі ў раллю
паралелі
распаліся і супалі
ў наступнасць сплю

*
звыклае ў выклік
наўколле ў ловах
аловак
сціраецца спакваля

*
бяседа сабе
пісьмёны
для ўсіх
у мех
ссыпаецца бульба
люба

Крок

Валянцін ДУБАТОЎКА

Сімвал веры

У той травеньскі дзень, калі Саветы зачынялі мястэчковы касцёл, я са сваімі аднакласнікамі ў полудзень бестурботна вяртаўся са школы. Пераскокваючы праз лужыны, заўзята падпіхваў сваіх сяброў у спіну і думаў пра смачную, з водарам сушанага кропу і часнаку тушаную капусту, якая чакала мяне ў хатняй печы. Хутка мінуўшы школьны стадыён, а затым кусты бэзу, што раслі паабапал дарогі, наша невялічкая кампанія выйшла на дзядзінец мясцовага каталіцкага храма. Столькі народу, колькі сабралася ў той дзень каля касцёла, я не бачыў да гэтага ніколі. Жанчыны голасна плакалі і маліліся, мужчыны моцна лаяліся і, амаль не хаваючыся, бэсцілі савецкую ўладу ды мясцовых камуністаў. Старшыня калгаса, высокі лысаваты мужчына, крычаў штосьці па-расейску і піхаў у спіны людзей, якія заміналі падводам, што пад'язджалі да святыні. Людзі злосна зыркалі яму ўслед і моўчкі адступалі да мураванай агароджы. На прыступках касцёла я заўважыў нашага суседа, дзядзьку Ладзіка; ён вывалокаў з храма драўляную фігуру арханёла Гаўрыіла. Стары касцельны вартаўнік аддана жагнаўся.

— Ты што, стары, здурэў? — галёкнуў Ладзік, загружаючы скульптуру ў воз. — Гэта ж толькі дровы. Ды прытым яшчэ і сухія! Ха-ха-ха....

На смех кемлівага камуніста натоўп адказаў напружаным маўчаннем. Але тут да Ладзіка падскочыў старшыня калгаса і нешта зашаптаў яму на вуха. Актывіст чарговы раз заўзята зарагатаў і з яшчэ большым імпэтам пачаў грузіць у воз разабраны касцельны алтар.

Я ніколі не забудуся, як глядзелі на мяне праз прастрэлы драбін, нібы праз турэмныя краты, сумныя вочы драўляных анёлаў. Нагрузіўшы воз да верху, Ладзік утульна ўладкаваўся на спіне Святога Паўла і адвязаў лейчыны.

— Но-о-о, пайшоў! — загарланіў ён.

Конь здрыгануўся, упёрся ў мокры мурог дзядзінца, і перагружаная падвода рушыла ўперад. На самым нізе вазка ляжаў завалены іншымі скульптурамі драўляны вобраз Збавіцеля. Яго правая рука валаклася па дарозе, пакідаючы на ёй выразны адбітак некалькіх пальцаў. Мне чамусьці падумалася: «Як жа яму балюча, калі мокрая зямля трапляе пад пазногці».

А Збаўца зноў і зноў заграбаў сваімі кволымі пальцамі мокрую зямлю сваёй апошняй дарогі. Мы беглі за гэтай перагружанай падводай нейкі час, аж пакуль мяне не паклікаў раззлаваны маёй бязглуздасцю бацька. Я добра памятаю, што ён мне тады казаў.

— Тыя людзі, што цяпер рабуюць наш касцёл, сынок, варагуюць не з ксяндзамі і касцёламі, а з намі, і галоўнае — са сваімі дзецьмі і ўнукамі.

Даўным-даўно мінула мілае дзяцінства. Незаўважна пранеслася поўнае спадзяванняў і надзей светлае юнацтва. І чым бліжэй да мяне падыходзіць няўмольная старасць, тым выразней і выразней паўстаюць у памяці сумныя вочы тых, спаленых мястэчковым актывістам, апосталаў. І драўляны вобраз Збаўцы, які чапляецца кволымі пальцамі за карэнні дрэў на сваёй апошняй дарозе, быццам баіцца пакідаць нас сам-насам з гэтым бязбожным светам...

Крок

Ён стаяў на падаконніку дзясятага паверха дома, у якім пражыў амаль дваццаць гадоў запар. Галаву абцяжарвала толькі адна сумная думка: чаму ўсё так атрымалася? Ён не шкадаваў сябе, ён нават не перажываў за тое, як будзе балюча родным пасля яго заўчаснай смерці. Толькі ўсё тая ж думка, як хвароба, грызла і грызла яго душу: чаму, чаму так атрымалася?! Ён апошні раз зірнуў у неба і без развагаў зрабіў крок насустрач вечнасці...

А пасля на дыване з паламаных кветак, сярод дагледжанай жыхарамі дома клумбы, ляжала без руху цела паэта. Нехта скажа: не вытрымаў суровай рэальнасці. Іншыя будуць разважаць: маляў, стаміўся жыць. Бо што яшчэ могуць сказаць людзі, якія ведалі яго толькі па яго вершах...

***

Алесь Дзяцел стаў наведваць гуртка маладых літаратараў пасля таго, як у газеце «Літаратура і Мастацтва» з'явілася першая невялічкая нізка яго вершаў. У творчы студэнцкі гурток запісваліся напрыканцы васьмідзясятых амаль што ўсе, хто браўся тады за пяро.

У мінулую пятніцу Алесь атрымаў позву ў міліцыю цэнтральнага раёна сталіцы. Справа датычылася нібыта яго часовай прапіскі. На канверце быў пазначаны канкрэтны адрас. А дзявятай раніцы ён пазваніў у дзверы невялікага трохпавярховага будынка. Масіўныя дзверы са скрыгатаннем адчыніліся, і на парозе з'явіўся мужчына сярэдняга росту ў адпрасаваным чорным касцюме.

— Добры дзень, вам каго? — холадна спытаў ахоўнік.

— Добры дзень, мяне выклікалі, — Алесь падаў позву.

Мужчына ў касцюме ўзяў з рукі Алеся скамячаную паперку і, не звяртаючы ўвагі на тэкст, прапанаваў маладзёну прайсці. Дзяцел прашмыгнуў у прыадчыненыя дзверы і агледзеўся. Усё было як быццам звычайна: шэрыя сцены, высокая столь. Толькі вось чамусьці ў гэтым будынку было вельмі мала народу — як на працоўны час. І надта ж мала святла. Пакуль ахоўнік дзесьці адыходзіў, Алесь пільна вывучаў месца, куды яму давялося трапіць.

— А-а-а, Аляксандар Іванавіч Дзяцел... Чытаў,чытаў вашыя вершы.

Алесь прыжмурыўся. З другога паверха па мураваных



сходах ціха, нібыта па паветры, спускаўся лысаваты, густоўна апрануты маладжавы мужчына. Працягваючы насустрач руку, ён з усмешкаю спяшаўся да агаломшанага маладзёна.

— Рады, рады, вельмі рады, — патрасаючы Алесеву руку, шчабятаў незнаёмец.

— Ды я... вось тут... па пашпартных справах, — не ведаючы, як паводзіцца, працадзіў скрозь зубы Дзяцел.

— Ведаю, праходзьце, праходзьце, — лысаваты стаў запрашаць маладзёна прайсці за ім. Алесь, аглядаючыся, амаль навобмацак рухаўся па прыступках. На трэцім паверсе яны звярнулі з лесвіцы і накіраваліся ў канец калідора. Замок клацнуў, і лысаваты мужчына знік за цяжкімі дубовымі дзвярыма, за ім паспяшаўся і Дзяцел. У кабінеце было таксама цёмна, як і ў калідоры, так што ён зноў прыжмурыўся.

— Аляксандар Іванавіч, у вас што... са зрокам праблемы? — спытаўся ўжо знаёмы голас.

— Ды не, проста мне падалося, што ў вас вельмі слаба асветлены кабінет.

На другім канцы пакоя пстрыкнула настольная лямпа. Святло ад яе ў імгненне запоўніла ўсё памяшканне. І толькі цяпер Дзяцел змог уважліва агледзецца. Высокая, добра пабеленая столь, аздобленая дэкорам, дасканала нацёрты масцікаю дубовы паркет. На вокнах шчыльныя зялёныя, як кіпарыс, фіранкі. Па́ра драўляных, з высокімі спінкамі крэслаў і масіўны канцылярскі стол пасярэдзіне.

«Хіба гэта не міліцыя?», — прамільгнула ў галаве Алеся думка.

— Вы, Аляксандар Іванавіч, цяпер напружана разважаеце, куды патрапілі? — спытаў, уладкоўваючыся ў адно з крэслаў, лысаваты мужчына.

— Так.

— Ну і якія меркаванні?

— У адным упэўнены: гэта не пашпартная служба.

Незнаёмец усміхнуўся:

— Я ўсім гавару, што гэты малады Дзяцел не дурны хлопец.

— Прабачце, каму гэта ўсім?

— Ну, напрыклад, свайму кіраўніцтву.

— Прабачце, а хто вашыя кіраўнікі?

— Як хто?.. Абласное кіраўніцтва Камітэта дзяржаўнай бяспекі... Дарэчы, старшы лейтэнант Віктар Іванавіч Ільчанка, будзем знаёмыя, — і старлейт працягнуў руку.

Але ад такога знаёмства Алесю стала неяк мулка: «Та-ак, зараз распачне вербаваць на службу. Папросіць ахарактарызаваць сяброў... Спытае пра наш гурток... Ён памыляецца... О-о, хрэн яму!».

Алесь прыўзняў падбародак і ўпэўнена зірнуў на гаспадара кабінета. «Ну-у, пачынай», — прашаптаў Дзяцел, але яго субяседнік усё нешта запісваў у нататнік і, здавалася, зусім не звяртаў увагі на свайго госця.

«Давай, пачынай допыт. Ты зараз пабачыш, як трымаецца сапраўдны патрыёт», — шаптаў сабе пад нос маладзён, але лысаваты мужчына, як ні ў чым ні бывала, працягваў нешта натаваць.

Алесь згараў ад нецярпення: «Ну, давай, давай», — ужо амаль услых прагаварыў маладзён.

— Вы, Аляксандар Іванавіч, паліце? — спытаўся па-сяброўску гаспадар кабінета.

«Гэта такія іхнія кэдэбэшныя штучкі, знаем мы пра іх. Вось я яму зараз...» — падрыхтаваўся Алесь і выдаў:

— Калі вы сабраліся мяне вербаваць, то ў вас нічога не выйдзе!..

Дзяцел смела глядзеў кэдэбэшніку ў вочы. Той спакойна скончыў запісваць, адклаў нататнік убок, запаліў цыгарэту і, прагна зацягнуўшыся, вельмі ціха, але ўпэўнена прамовіў:

— А навошта мне вас вербаваць? Я вось зараз нагадаю некаторыя гісторыі з вашага жыцця, і вы, калі я скончу чытаць, самі мяне будзеце ўгаворваць, каб я вас аформіў на службу.

— У вас нічога не атрымаецца, — адрэзаў Дзяцел.

Гаспадар кабінета з жалем паглядзеў на маладзёна, пасля чаго раскрыў шэрую папку і, адкашляўшыся, распачаў:

— Аляксандар Іванавіч Дзяцел нарадзіўся 20 кастрычніка 1968 года ў вёсцы Мошкі, Зельвенскага раёна, Гродзенскай вобласці. Скончыў Галынкаўскую сярэднюю школу ў 1985 годзе. У тым жа годзе паступіў на філалагічны факультэт БДУ.

Лысаваты перарваўся на хвіліну і, зірнуўшы на маладзёна паверх сваіх пазалочаных акуляраў, перапытаў:

— Усё правільна?

— Я не разумею, і што тут вы знайшлі крымінальнага, — з усмешкай адказаў Дзяцел.

Праз хвіліну старлейт са здзекам дадаў:

— Вось-вось, толькі ў дзяцінстве ў вас, Аляксандар Іванавіч, крымінала і не было. Хаця-я... Але пагаворым пра сённяшняе ваша жыццё. — Ён перагарнуў некалькі аркушаў і, зноў адкашляўшыся, працягнуў зачытваць: — Студэнт філфака Аляксандар Дзяцел на працягу вучобы ва ўніверсітэце сістэматычна ўдзельнічаў у рабоце антысавецкіх арганізацый і гурткоў.

— Гэта не антысавецкія арганізацыі, а патрыятычныя гурткі, мэта якіх — адраджэнне беларускай мовы і гісторыі, — выпаліў Алесь.

Афіцэр, спакойна перагарнуўшы наступны аркуш, дадаў:

— За гэтую, як вы кажаце, патрыятычную дзейнасць, малады чалавек, вас адлічаць з універсітэта. І вы вернецеся ў сваё Мошкі пасвіць кароў.

«Вось пра такі ўціск нас і папярэджвалі старэйшыя літаратары, што прайшлі ГУЛАГ», — прамільгнула ў Алесевай галаве думка, і ён імгненна адрэзаў:

— Нічо-ога, усе нашыя знакамітыя паэты пэўны час падпрацоўвалі пастушкамі.

Гаспадар кабінета, не зважаючы на Алеся, гартаў папку.

— А-а, вось, — кэдэбэшнік падхапіў нешта з папкі і накіраваўся да маладзёна, — ну, а пра гэта што скажаце, Аляксандар Іванавіч?

Старлейт працягнуў Дзятлу некалькі здымкаў. Алесь не паверыў сваім вачам. На іх было выразна відаць, як ён са сваім аднакурснікам Міколам Янушэвічам паліць анашу. У маладзёна перахапіла дух, сэрца амаль не выскачыла з грудзей. Ён сабраўся, як мог супакоіўся і ўпэўнена прамовіў:

— І што тут крымінальнага? Хлопцы паляць цыгарэты.

Кэдэбэшнік засмяяўся.

— Ну вы, Аляксандар Іванавіч, вясёлы чалавек. Нас зусім за дурняў трымаеце?

У гэтую самую хвіліну ён працягнуў маладзёну некалькі занатаваных лісткоў. Алесь чытаў і не верыў сваім вачам. Яго аднакурснік і закадычны сябар Мікола Янушэвіч у дэталях апісваў, як і калі яны разам ужывалі наркотыкі. Не чака-

ючы, пакуль Дзяцел дачытае, кэдэбэшнік вырваў з яго рук паперы, на якіх былі зафіксаваны паказанні Янушэвіча.

— А гэта, Аляксандар Іванавіч, нарката, за ўжыванне і распаўсюд якой — санкцыі сур'ёзныя. А ў вас цяжарная нявеста...

Алесь сапраўды кахаў сваю аднакурсніцу Алёну, і рашэнне нарадзіць дзіця яны прымалі ўзважана, калі ўжо набліжаўся час заканчэння ўніверсітэта.

«Бог ты мой, што ж рабіць?», — Алесь павольна вярнуўся да стала і прысеў на крэсла.

Старлейт адчуваў, як хвалюецца маладзён.

— Моцна кахаеш яе? — амаль па-бацькоўску спытаўся ён.

У адказ Алесь, пагаджаючыся, кіўнуў галавой.

— Ай-я-яй. Калі вас, Аляксандар Іванавіч, пасадзяць, куды яна з малым? — паспачуваў старлейт. — Нават уявіць цяжка....

У хлопца трэсліся рукі, шумела ў галаве: «Як жа я так мог пракалоцца! А як жа Алёна, а дзіця...».

Кэдэбэшнік затушыў недапалак, выцягнуў нейкі лісток са стала і працягнуў яго Алесю.

— Што гэта? — насцярожыўся той.

— Наша з вамі дамова. Мы абяцаем забыцца пра ўсе ўзгаданыя вышэй парушэнні. А вы, Дзяцел, пачынаеце па-сапраўднаму служыць сваёй айчыне.

— Якое служэнне, вы ж мяне сексотам хочаце зрабіць...

— Ну, па-першае, не сексотам, а супрацоўнікам, а па-другое, калі вы памятаеце, і пісьменнік-дэмакрат Грыбаедаў быў службоўцам галоўнага жандармскага ўпраўлення, і ваш зямляк, даследчык Цэнтральнай Азіі, таксама служыў у разведцы.

— Мне трэба падумаць, — адрэзаў Дзяцел.

Гаспадар кабінета, як быццам не пачуўшы сказанага, падняўся з крэсла, узяў асадку і падышоў да Алеся.

— Аляксандар Іванавіч, за дзвярыма вартавы. Ці вы тэрмінова падпісваеце гэтую паперу, ці... — ён развёў рукі ў бакі, — турма.

У кабінеце запанавала цішыня. Праз хвіліну старлейт у чарговы раз паціснуў плячыма:

— Вам жыць. Сяржант, зайдзі! — скамандаваў гаспадар кабінета, пачуўся шум за дзвярыма.

— Ну добра, добра, — амаль закрычаў Дзяцел. Рука дрыжала і неяк сама па сабе стала выводзіць подпіс. Недзе глыбока ў душы ён пратэставаў, не пагаджаўся, а рука ўсё ж не спынялася. Як толькі ён паставіў подпіс, афіцэр тут жа прыбраў падпісаную дамову, акуратна паклаўшы яе ў тую ж шэрую папку, а тады дадаў:

— Во-ось. І яшчэ... я забыўся вам сказаць, Аляксандар Іванавіч, што вы за сваю дзейнасць, як і прынята ў нас, будзеце кожны месяц атрымліваць заробітную плату. Гэта для маладога жанатага чалавека неблагая падпітка. Ці не так?

Але Алесь ужо нічога не чуў, ён, як зачараваны, падняўся з крэсла і рушыў да дзвярэй.

— Не забудзьцеся, Аляксандар Іванавіч, мы сустракаемся з вамі напрыканцы кожнага тыдня, — наўздагон крыкнуў старлейт.

А Дзяцел ужо ні на што не звяртаў увагі. Ён моўчкі выйшаў з кабінета, а потым і з будынка — з адзінай думкай у галаве: «Як я мог?!». Яму было брыдка за сябе. Успомнілася, як ён асуджаў тых, хто здрадзіў вялікай ідэі адраджэння і пачаў служыць рэжыму... «А тут сам, сам пайшоў на супрацоўніцтва. Не-е, зараз вярнуся і разарву гэтую смярдзючую дамову». У нейкую хвіліну цяжкая туга адступіла, ён бадзёра развярнуўся і, высока падняўшы галаву, рушыў у адваротным накірунку: «Та-ак, зайду ў іх смярдзючы склеп і

важнай, як для сябе, так і для сваёй вялікай краіны. Бо, калі б не яго праца, не праца такіх жа, як ён, адданых службістаў, дык што сталася б з нашым вялікім Савецкім Саюзам...

***

У прасторым кабінеце на трэцім паверсе шэрага трохпавярховага будынка сталіцы, згорбіўшыся над сталом, сядзеў амаль зусім лысы чалавек гадоў пяцідзесяці — маёр КДБ Віктар Ільчанка. Ён паціху пацягваў гарачую гарбату і гартаў справу

кіраўніцтва і замежныя ворагі развалілі вялікую краіну, дзе яго, адукаванага маладога працагаліка насамрэч чакаў поспех: «Усё яны, гэтыя фанабэрыстыя пісакі, гісторыкі, вучоныя. Яны вінаватыя, што мары не здзейсніліся. Свалата, падлюкі!»...

Ільчанка ўскочыў з крэсла і рушыў да акна. Па гарадскіх вуліцах гойсалі іншамаркі, кудысьці спяшаліся мінакі. Ён у чарговы раз глытнуў гарбаты. У гэтую хвіліну пачуўся стук у дзверы. Хуценька вярнуўся на месца, сабраў паперы, раскіданыя па стале, і закінуў іх у папку.

— Заходзьце!

Дзверы павольна адчыніліся, і ў кабінет уваліўся спіты непаголены чалавек, апрануты ў брудны, старога пакрою касцюм, якія насілі студэнты напрыканцы васьмідзясятых.

— А-а, гэта ты, Дзяцел... Ізноў напіўся. Болей грошай не атрымаеш, — адрэзаў Ільчанка.

Чалавек у брудным касцюме хутка рушыў да стала:

— Ты, сука, мне сёння ў два разы больш нальеш.

— За што гэта?

— А ты што, не ведаеш, што сярод тых, каго ўзялі ўчора на плошчы, быў мой сын?



Фота www.tut.by



скажу гэтаму сабаку ўсё, што я пра яго думаю, і хай будзе, што будзе». Але з кожным наступным крокам упэўненасць недзе знікала. Калі ён раптам аказаўся каля знаёмых яму дзвярэй, упэўненасць зусім знікла. Ён павярнуўся і хутка рушыў прэч ад збрыдлага будынка.

«Я, Аляксандар Іванавіч Дзяцел, даю згоду на супрацоўніцтва...», — старлейт Віктар Ільчанка спакойна расправіў скамечаны перапалоханым маладзёнам аркуш, закрыў папку і, расшпіліўшы пінжак, па-гаспадарску разваліўся ў крэсле. Думкі ішлі няспешна і звыкла: «А то зацягнуў песню: не бу-уду, не прыму-сіце... Ды хто ж цябе будзе прымушаць! Такіх, як ты, «патрыётаў» у мяне з дзясятак набярэцца. І хоць бы хто не пагадзіўся. А-а!». Ільчанка, шукаючы нешта вачыма, акінуў поглядам свой кабінет: «Трэба выпіць кавы». Ён бадзёра падняўся з крэсла і ўключыў электрачайнік. У яго не было ні спачування да гэтага маладзёна, якому ён пэўна што зламаў лёс, ні пагарды да сябе самога. Ён проста рабіў справу, якую лічыў вельмі

Скулы на твары пажылога маёра загойсалі, як жаўлакі. Вочы злосна прыжмурыліся: «Гэта ўсё яны, гэтыя ванючыя інтэлігенты-інтэлектуалы!». Ён злосным поглядам акінуў свой кабінет: «Якая брыдоціна!». Усё той жа невыносны шэры кабінет. Смярдзючыя, спітыя дарэшты агенты

свайго даўняга агента — паэта-патрыёта Алеся Дзятла. Той мусіў неўзабаве да яго зайсці. Успомніліся былыя слаўныя часы, калі ён быў яшчэ маладым перспектыўным афіцэрам, якога вось-вось мусілі перавесці на павышэнне ў Маскву, у горад мараў і вялікіх перспектыў. Ад той пары мінула амаль дваццаць гадоў. Скулы на твары пажылога маёра загойсалі, як жаўлакі. Вочы злосна прыжмурыліся: «Гэта ўсё яны, гэтыя ванючыя інтэлігенты-інтэлектуалы!». Ён злосным поглядам акінуў свой кабінет: «Якая брыдоціна!». Усё той жа невыносны шэры кабінет. Смярдзючыя, спітыя дарэшты агенты. І няўмольна надыходзіць пенсія. Чаму ўсё так здарылася? Бязвольнае

— А прычым тут я? Гэта ж ты мне іх здаў, — са здзекам вымавіў маёр.

— Я ж цябе папярэджваў! Папярэджваў, каб майго хлопца пакінулі на волі, у яго ж дзяржаўны экзамен праз тыдзень!

Ільчанка заўважыў, з якой злосцю глядзіць на яго гэты чалавек. Ён падняўся з крэсла і падышоў да Дзятла:

— Ну, ну-у, чаго ты, Аляксандар Іванавіч, чаго ты... вось, прысядзь на крэсла.

Дзяцел павярнуўся да яго тварам.

— Віктар, дапамажы майму хлопцу, я цябе ад усёй душы прашу.

Ільчанка пакасіўся на прамоўцу. На яго глядзелі запоўненыя слязьмі змучаныя вочы

няшчаснага чалавека. Маёр хутка вярнуўся да стала і разгарнуў папку.

— Ну вось глядзі, Аляксандар Іванавіч. Сын твой — адзін з самых актыўных пратэстоўцаў, арганізатар шэсця, гарланіў «Жыве Беларусь», аказваў супраціў АМОНу. Не-е, ён рэальна сядзе...

— Дык што ж рабіць? — з адчаем прашаптаў Дзяцел.

Ільчанка ўсім сваім відам паказваў, быццам ён думае, як дапамагчы хлопцу. І тут раптам амаль падскочыў.

— Слухай, Аляксандар Іванавіч. Я вось дам каманду — і твайго хлопца сёння ж выпусцяць...

Пры гэтых словах на заплаканым твары Дзятла з'явілася стрыманая ўсмешка, а яго субяседнік працягваў:

— Але ты, Аляксандар, пагаворыш з сынам, каб ён пайшоў з намі на супрацоўніцтва.

Твар агента пасур'ёзнеў:

— Ты што, Віктар, ён жа не такі, як я. Ён не пагодзіцца ні за што на свеце!

Кэдэбэшнік з'едліва ўсміхнуўся:

— Я ў гэтым кабінеце нешта падобнае ўжо чуў гадоў дваццаць таму.

— Ён не такі, як я, табе не ўдасца яго зламаць! — амаль выкрыкнуў Дзяцел.

«Ты паглянь на яго, ажыў», — прамільгнула ў галаве Ільчанкі думка. Ён у чарговы раз з'едліва ўсміхнуўся:

— Значыць, давядзецца распавесці яму і яго сябрам, хто яго бацька.

— Не смей, не сме-е-ей! — закрычаў на ўвесь кабінет Дзяцел.

Ільчанка падняў слухаўку тэлефона і нешта сказаў. Праз хвіліну дзверы адчыніліся, і ў кабінеце з'явіўся дзяжурны.

— Выклікалі, таварыш маёр?

— Так.

— Слухаю вас.

— Вось бачыш гэтае ванючае г...

— Так.

— Выкінь з кабінета.

— Ёсць.

— У цябе нічога не атрымаецца! У цябе нічога не атрымаецца! — адчайна гарланіў Дзяцел.

Дзверы зачыніліся. Ільчанка хуценька ўхапіў са стала сурвэтку і стаў праціраць крэсла, на якім сядзеў няшчасны паэт: «Ён не такі, ён не такі... Чулі мы гэта не адзін раз». Ільчанка выкінуў у сметніцу сурвэтку і выцягнуў з кішэні насоўку, якой стаў старанна выціраць рукі: «Усе вы аднолькавыя, вы і дзеці вашыя. І нікуды вам ад нас не дзецца».

Алесь ішоў па горадзе, і яго галаву не пакідалі страшныя думкі пра тое, як ён падвёў сына: «Я мушу дапамагчы яму. Гэта я вінаваты, што ён у турме. А Ільчанка, паскуда, думае, што ўсе такія, як я...».

Дзяцел зайшоў у дом, у якім жыў амаль дваццаць гадоў. Вось ужо і кватэра, рука пацягнулася ў кішэню па ключы: «Не-е, і што я скажу жонцы? А сыну, калі выйдзе з вязніцы? Не, не, не...».

Ён рушыў па сходах прэч. Ногі панеслі наверх. Мінуў адзін паверх, потым наступны, потым яшчэ і яшчэ. Алесь адчуваў лёгкасць. Сэрца радасна трымцела ў грудзях. Першы раз за апошнія дваццаць гадоў ён добра ведаў, што мусіць зрабіць: «Та-ак. Я не дам ім, не дазволю зламаць яго!».

Выбар быў вызначаны. І гэты крок ён мусіў зрабіць сам...



Свет мой белы



Марыя БАРАВІК

Снежанец

Як восень збегла — у канец,
Дык расцвітае снежанец,
І на стале, і ў сэрцы мрой,
Гаворыць колерам-зарой.
Званочкі звесіў снежанец,
Як восень збегла — у канец,
Дух аздабляе фарбай мрой
Такой парой.
Сваёй парой.

* * *

Зіма, мне постаць пакажы,
Каб дух незамярзальны жыў.
Зіма, мярэжу развяжы
мяцельнай музыкі душы...

* * *

Кладу на снег пералётны
(Юны і чысты целам)
Позірк вачэй вільготных.
І гэты лісток свой белы —
На ўражлівую душу.
Якую думку я запішу —
Адпраўлю пісьмом зімовым?
Неба чакае слова.

* * *

Сыплецца пер'е зімы
На сосны і на яліны.
І абрастуць галіны.
І птушак убачым мы,
Белых і нерухомых,
У баравых харомах,
Дзе дакранецца да цішыні
Наш рухалюб-цягнік,
Лётна-зямны й прамы,
Увесь у пер'і зімы,
Як і сасонкі, як і яліны,
Як і мы ва ўспамінах.

* * *

Снег у пояс. І мне да хаты
Поле не пераскочыць.
Ды адчуваю, што вочы таты
За полем з акенца сочаць.
То я таплюся, то выплываю,
Яснее поле. Марозіць.
Сцяжынка петліцца снегавая
На татаў позірк.

* * *

Наш лес зашэрыла зіма.
Недатыкальныя кусты.
Але ў душы зімы няма.
Там цёпла. Там вітаеш ты.

Таму і ўся зіма вакол:
І тая, што ўкрывае дол,
Якая роем белых пчол,
Перада мной, нібы Анёл;

І тая, што ў хвіліне сцюж
Схаваць мне раіць капялюш,
Да хвілі лютаўскіх уцех —
Да чорнай птушкі на хвасце;

І тая, што ў тугім пласце
Жыццёвым (лёсава расце)
У разнавіднасці сваёй —
Уся; я размаўляю з ёй.

Яна мне колеры дае
Як дзень надзеі настае,
Бо свет мой белы непусты —
У ім ёсць цуд вясновы — ты.

Ёсць думнавей з мінулых зім,
Якім я ўдзячная, усім.
І сніцца каляровы снег,
Які застаўся у вясне.

Там звыш усмешліва было,
Бо снег той абдымаў цяплом...
Па струнах памяці сама
Вядзе смычком мая зіма.

Чыстая

Ноч святлее. Бо ў акне — снег.
Рух нябесны — у акне снег.
З вышыні бярэ разбег снег.
Дзень прачнуўся, развіднеў — снег.
Пагусцеў і памацнеў снег.
На яліне, на сасне — снег.
Як рукою скалыхнеш — снег.
— Ці праспалі, дзеці, снег?



— Не-е-е!
Паляцеў дзіцячы смех:
«Сне-е-е-ег!»

* * *

Уся ваколіца — зіма.
І ранак неба не ўзнімаў.
Усё закуталася ў бель.
І я ступаю ў белы хмель.
Такая лёгкая вада
Прыйшла на вейкі асядаць,
На шчокі, вусны і каўнер;
І ў гэткім вобразе цяпер
Дае пачуць забыты смех
Вада, якая — першы снег.

* * *

Ах, дзьмух зімы! Які прыгожы!
Аснежыў вобраз маці Божай.

І юная зіма-Анёл
У бель замройніла касцёл.

Зімовы вобраз маладзы
У кожнай зорачцы вады.

У творах з белае вады —
Свабодны дух і вольны дых.
У сонным вэлюме абшар;
І ў думнасці мая душа.

* * *

На яблыні прачнуўся пух.
Яго збудзіў чубаты рух —
Сігналіць мне — у пачуццё,
Што там харчуецца жыццё.

Кранулася і цішыня,
Нібыта ветрык рушыў пешкі.
Прачнулася і вышыня
Пухната-сонечнай усмешкай.

Лютніца

Праз сто гадоў...
Барысу Кіту, якому —
107 гадоў.

На рэвалюцыю глядзець?..
Ну ж і дапытлівы дзіцёнак!
Яшчэ не Кіт, яшчэ Кіцёнак.
Дык не адмерзлі ногі ледзь?

Той люты так схапіў за пяты,
Што у паветры халадоў
Ён стаў Кітом; пра тое «свята»
Нам распавёў праз сто гадоў.

З вяселля

На рэвалюцыю глядзець?..
А я (пазней) дык — на вяселле,
У снезе не па вушы ледзь,
Па хутарскому пустазеллю.

Зваротна з Грышкава вяселля
Мы з мамай у снягах заселі
На шырыню начнога поля —
Такую люты даў нам волю.

Мы шляху вымералі мілі;
Ім свой пагорак абкруцілі;
Адзін і той жа куст лазы
Мы абагнулі тры разы.

Дык страху крышачку нясём...
Мне мама кажа: «Сунь — і ўсё!».
А сунешся куды далей?..
Як ля куста — нібы цяплей...

...Сцякаў у хаце хітры снег.
На печы грэўся татаў смех —
Рабіў на хітрыкі замах:
«Я сніў, што дома вас няма».

Здаецца, твар мой цвіў, як мак.
Дашкольная была зіма...

* * *

Застылі!
Цяжка дзьмуць вятрам...
Маўчыць прымерзлы дух народа.
І затрымалася зара,
І сніць нялёгкі сон Свабода.
Зусім застылая пара,
Між сэрцамі — снягоў гара;
І толькі — плеск падлёднай мовы,
Дзе так цяснютка плыні слова.
Найзацяжнейшая пара.
Пара напругі і нязгоды...
Але й нябесная пяра:
Хоць верша — слова ад Свабоды.

* * *

Як нібы набліжаецца анёл
У пошуку замучаных жывёл.
Як нібы ніц упаў мой
стромкі дух –
Асірацела вуліца і рух,
І той падстрэшны,
ледзяны куток,
Дзе еў з рукі пакінуты каток,
Дзе страшна і халодна аднаму,
Дзе ён мужнеў, і не адну зіму.
Цяпер халодна вершыку майму.

Нябесная патрэба

Мой пэндзаль мроіць пра вясну
(На шкле мароз малюе рэбус).
А за вакном такое неба,
Што толькі ахнуць і ўздыхнуць.

Во гэта дрэва сняць гракі.
І ўжо душа глядзіць з рукі:
Яе мастацкая патрэба —
Малюнак неба.

Хто мае думкай пацяплець,
Дык прапусці яе праз сэрца.
Няхай хоць песняй застаецца —
Са струн гітарных узляцець.

Ідзе лірычная пара,
І ўжо душа шчыміць з пяра:
Яе нябесная патрэба —
Сягаць у неба.

* * *

У сеціве жыцця — адзіны час
Для нас, ад часу нашага прыходу.
Пакуль я ёсць (дыханнем
сярод вас)
У тканцы руху ветлівай
прыроды,
Жыве на вуснах кожная пара:
Яе характар, колер і прыгода,
Як гэта навагодняя зара,
Убеленая снегам.
З Новым годам!

Небяспечныя сувязі: Алена Васілевіч і Астроўскія

Быў малады, а таму, мякка сказаўшы, не зусім разумны. Гэта ж колькі можна было ўведаць! Але што-колечы асела ў памяці і час ад часу падавала сігналы, нагадвала пра сябе.

Казіміра Астроўскага паўстынцы (жыхары вёскі Паўстынь Слуцкага раёна) называлі панам. І складвалася такое ўражанне, што ён быў тамтэйшым землеўладальнікам.

Пан Казімір і памёр у Паўстыні, і пахаваны на вясковых могілках. Тую магілу мне рупіла і рупіць наведаць зноў. Сярод іншых магіл яна вылучалася нізкай металёвай (пэўна, жалезнай ці сталёвай) агародкай…

Пан Казімір знакаміты хоць бы тым, што ягоным сынам быў Радаслаў Астроўскі, педагог, заснавальнік першай беларускай гімназіі (у 1917 годзе ў Слуцку), дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, аўтар, здаецца, першага беларускага навучальнага дапаможніка па астраноміі, палітычны дзеяч, намеснік Браніслава Тарашкевіча ў Беларускай Работніцка-Сялянскай Грамадзе, а ў вайну — прэзідэнт Беларускай цэнтральнай рады.

Нейк падумаўшы, што трэба ўсё ж з'ездзіць у Паўстынь, я згадаў адну размову з нашай пісьменніцай Аленай Сямёнаўнай Васілевіч. Яна між іншым сказала, што нехта з сям'і Астроўскіх быў яе хросным бацькам. Так мне запомнілася. Гэта, згадзіцеся, цікава… Ведама, у тым, што нехта з Астроўскіх хрысціў малую Алену Васілевіч, нічога дзіўнага няма, бо Алена Сямёнаўна па маці шляхцянка і жыла ў засценку Даманшчына (другая назва — Ліпнікі), што за тры вярсты ад Паўстыні. Калі адрозненне паміж шляхтай і мужыкамі адчувалася яшчэ і ў 1980-х, дык што казаць пра пачатак 1920-х? Мне хацелася высветліць, хто з Астроўскіх прамаўляў у царкве за маленькую дзяўчынку словы Сімвалу веры.

Была ў гэтым факце — факце хросту Алены Васілевіч чалавекам з роду Астроўскіх — і інтрыга. Я нават падумаў быў: Алене Васілевіч пашанцавала, што яна нарадзілася ў 1922-м, што чарговая хваля бальшавіцкага тэрору ў БССР пракацілася, калі ёй было 15–16 гадоў. Вядома, узрост быў ужо расстрэльны, і за небяспечныя сувязі, сувязі з «класавымі ворагамі», дзяўчына таксама магла трапіць пад каток, але непаўналетніх тады арыштоўвалі, як правіла, услед за бацькамі. І ўсё ж сувязі, паўтаруся, былі небяспечныя, і апавядаць у сталінскім, нават у хрушчоўскім СССР пра тое, што ты маеш нейкае дачыненне да радні «таго самага» Астроўскага, было б вельмі і вельмі неабачліва.

З думкаю пра паездку ў Паўстынь я пайшоў да Алены Сямёнаўны. Вельмі рупіла мне даведацца, хто ж быў хросным у яе, дзе і як ён жыў.



Слуцкая гімназія. Пачатак XX ст.



Радаслаў Астроўскі

Бог смяецца, або Сёе-тое з радаводаў

Не буду казаць пра атмасферу гутаркі з Аленай Сямёнаўнай і яе блізкімі. Сустрэліся людзі, якія ведаюць тую старану і людзей тае стараны. Не цяперашніх людзей, а тых, што былі і што дажываюць веку.

Занатаваў я падчас тае сустрэчы, што насельніцтва Даманшчыны-Ліпнікоў складалі, па-тамтэйшаму кажучы, Няронскія, Бараны́, Балваны́ і Гурыны́. Гэтак «рыфмаваліся» прозвішчы Бараноўскіх, Балвановічаў і Гурыновічаў. Былі і людзі з падвойнымі прозвішчамі: Ждановіч-Гурыновіч ды Лебедзеў-Няронскі.

З тае гутаркі даведаўся я, што ў 1920-х у Паўстыні жылі дзве дачкі пана Казіміра Іванавіча і пані Эміліі Ільінічны Астроўскіх: Юлія Казіміраўна і Марыя Казіміраўна.

Юлія Казіміраўна выйшла замуж за Пятра Фоціевіча Бараноўскага, якога акалічны люд зваў Петрусём Фотавым, а Марыя Казіміраўна стала жонкаю былога чырвонага партызана (гэта значыць, партызана, які ў 1919–1920 гадах змагаўся з польскімі акупантамі). Было ў таго партызана арыстакратычнае прозвішча — Сапега.

Калі пра Пятра Бараноўскага можна сказаць, што ён быў тамтэйшы шляхціч, дык пра Сапегу такой яснасці няма: невядома, адкуль ён з'явіўся ў Паўстыні.

Меркаваў я пасля гутаркі з Аленай Сямёнаўнай і яе блізкімі падацца ў Паўстынь, паглядзець на магілку пана Казіміра і нават сфатаграфаць яе (ведама, калі яна засталася). Але, як той казаў, чалавек плануе, а Бог смяецца, бо «мысли и дела он знает наперед». Перш адна, а потым другая хвароба, неабходнасць захоўваць дыету і рэжым, глытаць 12 таблетак на суткі не далі здзейсніцца майму плану. А ехаць позняй восенню ці зімой не выпадае: чамусьці мала хто вітае здымкі, зробленыя аб такой пары.

Не маючы мажлівасці вырвацца з Менску ў пару зялёны ці залатой восені, я здолеў высветліць, што пан Казімір Астроўскі ў сціслым значэнні гэтага слова панам не быў. Мяркуючы па тым, што ён жыў то ў Слуцкім, то ў Пружанскім, то зноў у Слуцкім паветах (пры гэтым не ў адной і той самай мясцовасці Случчыны), я зрабіў выснову, што пан Астроўскі быў арандатарам. Гэтую маю выснову пацвярджаюць дзве ёмістыя кнігі Дзмітрыя Дразда пра землеўладальнікаў Менскай губерні. Не значыцца пан Казімір Астроўскі сярод іх, і паўстынскія землі яму не належалі. А ўзяўшы пад увагу, што пан Астроўскі лічыўся мешчанінам горада Нясвіжа, я зрабіў выснову, што быў ён з «разабранай» шляхты: з тае шляхты, якая не змагла дакументальна пацвердзіць сваё шляхецтва і была пераведзена або ў заходнія аднадворцы, або ў казённыя мужыкі, або ў мяшчане. Падобны лёс напаткаў і продкаў Яна Луцэвіча — Янкі Купалы. Пераведзеныя ў мяшчане, Луцэвічы таксама жылі на арэндах, маючы субарандатараў і парабкаў. Ці меў субарандатараў пан Казімір Астроўскі, пакуль што пэўнасці няма.

Як яны жылі

Панна Юлія Астроўская, стаўшы пані Бараноўскай, разам са сваім Петрусём Фоціевічам жыла на хутары Мілешава, што быў непадалёк ад засценка Кублішча (Кублішча — гэта па дарозе з Паўстыні ў Рабак; глядзіце на сучасных мапах, калі ад засценка нешта яшчэ засталося.)

Былі 1920-я гады. Новая эканамічная палітыка. Заклік Мікалая Бухарына «Абагачайцеся!». І заклік Аляксандра Чарвякова «Багацей, селянін, бо чым багацейшы ты, тым багацейшая наша краіна». Гэты час застаўся ў памяці слуцкіх сялян і шляхцічаў-земляробаў як час, калі яны былі гаспадарамі.

У Мілешаве Бараноўскія пабудавалі дом з высокім ганкам. У доме былі, што не магло не кінуцца ў вочы малой Алене Васілевіч, вялікі пакой і фарбаваная падлога, а абедзенны стол быў пакрыты блакітнай цыратай. Мелі Бараноўскія дзве каровы, авечак і кабылу з жарабём. Само сабой, у свінушніку рохкалі свінні. Зноў жа, Алене Васілевіч запомнілася, што елі Бараноўскія ды іх госці кожны са сваёй талеркі, а не з агульнай міскі, як тое было ў звычаі ў мужыкоў і ў шарачковай шляхты. А прасяную кашу пасыпа́лі цукрам, што таксама не магло не ўразіць.

А наведвала малая Алена дом Бараноўскіх таму, што Пётр Фоціевіч Бараноўскі, швагер Радаслава Астроўскага, быў ейным хросным бацькам.

Што ж тычыцца Марыі Казіміраўны Астроўскай, цяпер ужо Сапегі, дык жыла яна ў Паўстыні, у самым канцы вёскі, у бок Барэцкага лесу. (Барэцкі лес таму, бо рос ён каля засценка Боркі.)

У доме Сапегаў Алене Васілевіч запомнілася зала з авальным сталом, вакол якога стаялі крэслы. А яшчэ ў зале было піяніна. І быў у доме дзіцячы пакой з дзіцячымі ложкамі і са сталом для лялек і цацак. Па тым часе ды для вёскі — раскоша.

А яшчэ што не магло не ўразіць, дык тое, што сёстры Астроўскія, калі выбіраліся ў Слуцак, мелі на галовах не хусткі, а капелюшы…

Іх лёсы

У пані Юліі і Пятра Бараноўскіх быў сын Жэня 1924 года нараджэння. І яшчэ дзве дзяўчынкі — дачушкі раскулачанай сястры Пятра Фоціевіча.

Не маглі бальшавікі не раскулачыць і Бараноўскіх. У рэшце рэшт яны трапілі ў Саратаў — горад, куды саслалі нямала беларусаў (дастаткова згадаць хоць бы Язэпа Дылу і Вацлава Ластоўскага). Юлія Казіміраўна выкладала ў Саратаве нямецкую мову (з гэтага мы робім выснову, што яна скончыла жаночую гімназію), а Пётр Фоціевіч працаваў рахункаводам. Сын, Жэня, паступіў у Саратаўскі ўніверсітэт, але вучобу перапыніла вайна. Аднаго дня бацькі атрымалі «пахаронку» на свайго сына, адпелі яго ў царкве, памянулі. І якая ж была іх радасць, калі стала вядома, што ён жывы. Калі сын вярнуўся дадому, у яго, хто пабываў у нямецкім палоне, былі праблемы з аднаўленнем на ўніверсітэце. І ўсё ж дыплом ён атрымаў і прадоўжыў вучобу ў аспірантуры пры Іванаўскім педагагічным інстытуце, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. Як спецыяліст у галіне геаметрыі, загадваў адпаведнай кафедрай і быў прафесарам Іванаўскага ўніверсітэта. Каля яго, перабраўшыся з Саратава ў Іванава, дажывалі свайго веку Юлія і Пётр Бараноўскія. Па сабе прафесар Бараноўскі пакінуў сына і дачку.

Цяпер я думаю: добра, што Юлія Астроўская выйшла замуж, добра, што памяняла прозвішча, і нават добра тое, што яе саслалі ў Расію. Хто ведае, як склаўся б яе лёс у БССР, дзе ейны брат, учарашні камуніст, у 1929 годзе быў залічаны ў нацыянал-фашысты?

У пані Марыі Астроўскай, якая стала Марыяй Сапега, была дачка Віця, Вікторыя. Як і Бараноўскія, Сапегі таксама трапілі пад раскулачванне. Вядома, што па вайне яны жылі ў Алушце (Крым).

Нельга тут не згадаць Мікалая і Фядору Ждановічаў-Гурыновічаў. Мікалай Гурыновіч — гэта родны дзядзька Алены Васілевіч, брат ейнай маці, а Фядора — сястра Пятра Фоціевіча Бараноўскага. Іх фотаздымак з 1911 года можна ўбачыць у кнігазбораўскім выданні выбраных твораў пісьменніцы. Былі Гурыновічы гаспадарамі сярэдняй заможнасці, кажучы бальшавіцкай мовай — моцнымі серадняками. Мелі сваю ваўначоску і дагледжаны сад. Гэта яны прытулілі Алену Васілевіч, калі памерла яе маці. Гэта пра Мікалая Гурыновіча напісана ў аповесці «Расці, Ганька»: «Цяпер Ганька жыве ў дзядзькі»…

Калі навісла пагроза раскулачвання, Мікалай Гурыновіч паспеў з'ехаць у Днепрапятроўск (цяпер горад Дняпро) на будаўніцтва мастоў. Ягоную жонку, Марфу, бальшавікі выгналі з хаты і неўзабаве кінулі ў слуцкую турму, а потым этапавалі ў Менск і, паводле афіцыйных дакументаў КДБ, расстралялі ў Курапатах.

І пытанні

Той, хто чытаў кнігу "Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах", мог не адзін раз сустрэць на яе старонках прозвішча Бараноўскі. Складальнікі і каментатары высветлілі, што Бараноўскі Алесь і Бараноўскі Андрэй паходзілі з Машчыцаў Слуцкага павета. Першага яны запісалі ў мужыкі, а другога – у шляхту. Можна меркаваць, што машчыцкія Бараноўскія былі сваякамі Бараноўскіх з Даманшчыны. На гэта паказвае хоць бы той факт, што на пачатку 1920-х выпускнік Віленскага настаўніцкага інстытута Алесь Бараноўскі працаваў у Ліпніках, вёў там культурна-асветніцкі гурток "Вясковая зорка". Як "ворага народа", бальшавікі расстралялі яго ў 1938-м.

Ёсць і пытанні: хто такія, адкуль паходзілі Адам Бараноўскі, К. Бараноўскі і Фёдар Бараноўскі? А яшчэ адно пытанне такое. Мікалай Улашчык ва ўспамінах даволі часта згадваў свайго сябра, лекара Юзіка Бараноўскага, але не даў пра яго больш-менш вычарпальных біяграфічных звестак. Адкуль, з якой мясцовасці паходзіў гэты пакутнік за беларушчыну?

На гэтыя пытанні, хочацца думаць, адкажуць гісторыкі наступнай генерацыі.

***

У гэтым тэксце "па-за кадрам" застаўся сюжэт аб прыездзе ў Даманшчыну (Ліпнікі) на пачатку 1920-х гадоў Якуба Коласа. Але пра гэта я раскажу ў больш падрабязнай публікацыі пра пэўныя моманты ў жыцці народнага паэта.

Спадзяюся, гэты нарыс дае нейкае ўяўленне пра асяроддзе, у якім рабіла першыя крокі і ўваходзіла ў свядомае жыццё Алена Васілевіч.

Анатоль Сідарэвіч

Бліжэй да сонца

Згадкі пра сябра-мастака

Кожны раз, калі ў нашай свядомасці раптоўна ўсплываюць малюнкі дзяцінства, яны заўсёды чамусьці напоўнены зыркім сонечным святлом.



Мікола Маеўскі

Нават калі тое дзяцінства, з вышыні сённяшняга разумення, было далёка не райскім, наша памяць абавязкова знойдзе ў сваіх лабірынтах сонечную раніцу, напоўненую незямным водарам фантастычных кветак, страхотліва-велізарным, падобным на дыназаўра, конікам на зялёнай травінцы і не менш ірэальнай жамярой з вясёлкава-празрыстымі крыламі... Ды й само сонца было тады блізка-блізка, адразу за празрыста-пяшчотным шарыкам дзьмухаўца, які ад аднаго твайго подыху разлятаўся вясёлымі парасончыкамі...

Памятаецца, менавіта ў гэты, напоўнены сонцам, але ўжо не такім зыркім, як у дзяцінстве, а далікатна размытым смугою часу свет і вярнула мяне выстава твораў майго сябра, аднаго з самых адметных берасцейскіх мастакоў Міколы Маеўскага. «Бліжэй да сонца» — так, зусім не выпадкова, і назваў аўтар сваю, як аказалася, апошнюю персанальную выставу ў Берасці. За вокнамі бралася вясна 2010-га, ягоная шасцідзясятая вясна.

Бліжэй да сонца... Гэтым язычніцкім шляхам Мікола Маеўскі ішоў па жыцці з дзяцінства. Сонца вяло яго грыбнымі раніцамі па пушчанскіх нетрах у ваколіцах родных Дварцоў на Камянеччыне, дзе нарадзіўся мастак...

Сонца сустракала яго над казачнымі абрысамі старажытнага мястэчка, калі старшакласнікам дабіраўся вясковы юнак у камянецкую школу...

Сонца ўзыходзіла з таго боку, дзе была далёкая Радзіма, калі пасля мараходнай школы плаваў ён па экзатычных морах ды акіянах, занатоўваючы ўбачанае ў неразлучны альбом... Але сонечны шлях прывёў пушчанскага матроса зноў у Ленінград — сонца на альбомных малюнках перамагло марскую рамантыку: Мікола Маеўскі стаў навучэнцам мастацкай вучэльні імя У. Сярова і на Радзіму вярнуўся прафесійным мастаком. А ў памяці назаўсёды захаваўся акіянскі міраж:

— Уяўляеш сабе: ідзем у Аўстралію, і пасярод акіяна — два сонцы, адно спераду, другое ззаду. Аднолькавыя, на адной вышыні. Ззаду — сапраўднае, а спераду — фальшывае. Падумалася: напэўна, у кожнага чалавека ў жыцці бываюць два вось такія сонцы. Як не памыліцца, не пайсці за сонцам-міражом? Думаю, што мяне вывела на свой шлях праўдзівае сонца дзяцінства, што залацела вяршаліны пушчанскіх сосна, промнямі-стрэламі прабівалася праз вышчарбленыя байніцы таўшчэзных сценаў Белай вежы, люстравалася ў вірлівай рачной плыні... А яшчэ любоў. Любоў да ўсяго, з чым я рос, між чаго сталеў, што прыходзіла ў загадданыя акіянам сны. І што пасля, ужо ў берасцейскай майстэрні, папрасілася на палатно.

Вясёлкавы і пластычны ў сваіх творах, Мікола Маеўскі ў стасунках з людзьмі быў, бадай, чорна-белым. Калі кахаў, то аддана, не палавініўся і не разменьваўся, калі сябраваў, то ў любую хвіліну гатовы быў падставіць сваё моцнае мужчынскае плячо. Не ведаю, ці былі ў яго ворагі; проста людзей, якіх лічыў не здатнымі на шчырасць і ўзаемнасць, ён стараўся абмінаць. І аднойчы падманўшыся з даверам, выкрэсліваў чалавека са сваёй душы назаўсёды.

Пазнаёміліся мы на пачатку 80-х гадоў: Мікола атрымаў творчую майстэрню на Набярэжнай, якая па першым часе была і ягоным жытлом. Актыўна выстаўляўся: адметная творчая манера, свой, непаўторны мастакоўскі почырк звярнулі на сябе ўвагу і прафесіяналаў, і аматараў мастацтва. Маладога мастака заўважылі ў Мінску, не губляліся яго творы і на ўсесаюзных выставах.

Але звяла нас, здружыла сябрына «Край» — берасцейскае грамадска-культурнае аб'яднанне, народжанае як рэгіянальнае рэха славутай мінскай «Майстроўні». Праўда, спачатку з'явіўся «Дзівасіл», створаны гадаванкай «Майстроўні» Тацянай Сапач, якая пасля заканчэння БДУ прыехала працаваць на Брэсцкую студыю тэлебачання. Пазней, разам з мужам Сяргеем Дубаўцом, яны пераехалі ў Вільню, каб аднавіць выпуск газеты «Наша ніва» і тым самым абудзіць, аб'яднаць віленскіх беларусаў. Следам разам з сям'ёй з'ехаў і Алег Мінкін, якога мы лічым берасцейскім паэтам, бо менавіта тут нараджаўся яго першы паэтычны зборнік.

«Край» для ўсіх нас, прадстаўнікоў маладой творчай інтэлігенцыі Берасця, стаўся цэлай эпохай, бо быў адрозным і ад камсамола, і ад творчых саюзаў. Пазбаўлены афіцыёзу, жывы і дэмакратычны, а галоўнае — беларускі па духу. Складаней было з мовай: людзі ў «Край» прыходзілі розныя, але беларускамоўны асяродак, у які нияк незаўважна і натуральна ўліўся і Мікола Маеўскі, шырыўся, ягоная плынь разнявольвалася і дужэла. Зварот да айчыннай гісторыі, ад Гедыміна і Вітаўта да «нашаніўцаў», сустрэчы з беларускімі літаратарамі, знаёмства з традыцыйнай народнай культурай абуджала пачуццё ўласнай нацыянальнай годнасці, якое дзесяцігоддзямі старанна размывалася савецкім інтэрнацыяналізмам, а па сутнасці — русіфікацыяй, распачатай яшчэ кацярынінскімі губернатарамі, «святарамі» і «настаўнікамі».

Разам з Міколам Маеўскім у «Край» прыйшлі яго маладыя калегі Сяргей Казак і Наталля Чарнагалова, інстытуцкія выкладчыкі Валянціна Мароз і Марыя Новік, шчыравалі браты-паэты, выхадцы з «Тутэйшых», Анатоль і Васіль Дэбішы, ініцыятарка стварэння першага беларускамоўнага дзіцячага садка, выхавацелька-пісьменніца Валянціна Кукса, настаўніца першага і адзінага ў Берасці беларускага класа Ніна Чарановіч. Стараўся гэты клас пры актыўным удзеле «краёўцаў»: мы абышлі ўвесь прылеглы да школы мікраён, сустракаліся з бацькамі, збіралі іх заявы...

Яскравай падзеяй сталіся і першыя ў пасляваенным Берасці Каляды, у якіх наш калядны гурт падтрымаў народны ансамбль «Спадчына» з ягоным кіраўніком Уладзімірам Літвінчуком. Калядную зорку — сапраўдны твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які пазней і ўпрыгожыў экспазіцыю абласнога мастацкага музея, зрабіў Мікола Маеўскі. А яшчэ былі традыцыйныя Каза, Чорт, Цыганка... І песні, урачыста-віншавальныя і жартоўныя, вясёлыя танцы ў гарадскіх пад'ездах і кватэрах, проста на гарадскіх вуліцах. Перад калядянікамі гасцінна адчыняліся дзверы, поўнілася да краёў калядная торба...

Разам мы гукалі вясну, ладзілі Купалле, праводзілі перад выставачнай залай забароненыя ўладамі Дзяды... Усё гэта не магло не ўплываць і на творчасць Міколы Маеўскага. Думаю, што менавіта «Край» прывёў яго ў рэспубліканскую мастакоўскую суполку «Пагоня».

Назаўсёды застануцца ў памяці нашы сумесныя вандроўкі ў Міколавы Дварцы. Неяк ён мяне заінтрыгаваў:

— Паехалі, пабачыш нешта незвычайнае!

У Дварцах да нас далучылася археолаг з Мінска Ала Квяткоўская. Пушчанскімі нетрамі па аднаму яму вядомых прыкметах Мікола прывёў нас да выбрукаваных кругоў розных дыяметраў: адзін, другі, трэці... Прысыпаныя іглічай, парослыя мохам, амаль незаўважныя для староннягa вока. Што гэта?

— Магчыма, яцвяжскія капішчы ці пахаванні, — выказала меркаванне археолаг. — Глянце на Міколу, з яго самога можна яцвяга маляваць!

Мікола, хударлява-жылісты, з капной светлых валасоў, якія на кантравым сонцы свяціліся быццам німб, весела зарагатаў...

— Ты паглядзі, якія колеры, якія кантрасты! На жоўтым пяску блакітныя, нават сінія цені, цёмна-зялёны ядловец, далікатныя, як дзяўчаткі, бярозкі. Па сваім стылю я мастак далёка не рэалістычны. Але гэта ў майстэрні. А на пленэры я імкнуся быць максімальным рэалістам, каб захаваць тое, што ўразіла. Ужо ў майстэрні выпрацоўваецца кампазіцыя — гэта, бадай, самы складаны і самы творчы працэс. Затым квадрат палатна — я пішу апошнім часам мятровыя кампазіцыі — запаўняецца зусім рэалістычнымі дэталямі. Тут няма характэрнай для рэалізму перспектывы, няма ценяў — дэталі набліжаны як скрозь магутную оптыку. Фарбы кладуцца дзе густа, рэльефна, а дзе ледзь пакрываюць некалькімі мазкамі палатно. Быў неяк на выставе такі смешны выпадак: падышоў да маіх жытніх каласоў адзін са старэйшых нашых мастакоў Іван Рудчык, калупнуў фарбу пазногцем і пытаецца: ты што, зерня сюды панаклейваў?

«Творы Міколы Маеўскага выпраменьваюць радасць. Глядзіш на іх і разумееш, якая багатая на колеры, якая прыгожая і непаўторная наша краіна!» — такія водгукі мне не аднойчы даводзілася чуць на выставах. Думаю, што такой жа ўспрымалі Беларусь і замежныя гледачы на выставах у самых розных, блізкіх і далёкіх краінах. Ён і ў гэтых, замежных краінах маляваў экзатычныя краявіды, выстаўляў іх у Берасці. Вочы наведвальнікаў маглі захапляцца ўбачаным, але цеплынёй напаўняліся яны перад нашымі лугавымі ды рачнымі кветкамі, пушчанскімі пейзажамі. Бывала, азірнуўшыся,якая юная аматарка мастацтва асцярожна дакраналася да блакітных васількоў, каб адчуць іх жывую цеплыню...

Бліжэй да сонца... Неяк разам з суседам па майстэрні, сябрам-мастаком Міхасём Кебецам, яны змайстравалі невялічкі струг, замацавалі два ветразі (прыдаліся навыкі мараходкі) і выправіліся з Берасця па Мухаўцы, а затым з Пінска — уніз па Прыпяці — ажно да Петрыкава, Міхасёвай радзімы. Палессе прычаравала мастака не менш, чым яго родная пушча, вылілася ў шэраг палотнаў, назаўсёды засталося ў ягоным сэрцы цнатлівай беллю гарлачыкаў, векавечнымі дубровамі з яшчэ дзедаўскімі борцямі і калоніямі белых чапляў на вяршалінах. Нібыта па джунглях, блукалі сябры па чаратовых старыцах, заходзілі ў казачныя па сваёй прыгажосці прыткі: Гарынь, Убарць, Пціч... А колькі незабыўных сустрэч, твараў, гісторый!

— Плывем, а на высокім беразе — хатка, нібыта з мінулага стагоддзя. І адтуль чалавек махае рукамі, кліча: «Хлопчыкі, плывіце сюды, у мяне гарэлка ёсць, юшка варыцца, хлопчыкі, пагамаміць няма з кім...» Была і гарэлка, і наварыстая юшка, і гамонка каля вогнішча ледзь не да самага світанку...

— А вось бачыш рак на лугавых кветках — я яго там замаляваў. І ты думаеш дзе? — за два кіламетры ад ракі! Паняцця не маю, як ён туды дапоўз...

— А гэта ўжо кампазіцыя з майстэрні «Мой сябра вецер»: стужка Прыпяці з вышыні птушынага палёту, векавечныя дубровы паабапал і белыя ветразі, а недзе пад імі — мы з Міхасём.

А яшчэ было сонца, якое, штораніцы ўзыходзячы над рачной плыннню, вабіла вандроўнікаў, мацавала пачуццё еднасці з гэтым краем, з роднай зямлёй, яе гісторыяй.

Апошнія берасцейскія гады жыцця ў Міколы не заладзіліся: тарыфы на аплату майстэрняў неймаверна падскочылі, рэдкіх ганарараў ледзь-ледзь хапала, каб звесці канцы з канцамі. Дэпрэсія ў творцаў, ды й не толькі, праводзіць да аднаго, уяўнага паратунку... Майстэрню давялося здаць, а тут, да ўсяго, занядужала маці. І Мікола з'ехаў да яе ў Дварцы, як мог даглядаў, апекаваўся, выправіў у апошні шлях. І застаўся ў роднай вёсцы.

Як яму там, у вясковай цішы — ці пішацца, ці працуецца? І ці магчыма вось так, кінуўшы-рынуўшы, у далечыні ад галерэй і выставачных залаў, ці магчыма творцу заставацца творцам? Гэтыя пытанні задаваў я самому сабе на траскай лясной гравейцы да Дварцоў. І адразу ж, з першых хвілін сустрэчы, адчуў, убачыў у яго раней заўсёды ўсмешлівых вачах самоту. Але ж не быў бы то Маеўскі! Шляхецкі гонар, імкненне да незалежнасці ад усяго і ўсіх не дазвалялі ні жаліцца, ні тым больш плакацца. І толькі каля невялічкай сажалкі за хатнімі прыбудовамі, веснавая вывява якой ці не тры дзесяцігоддзі весела перад маім пісьмовым сталом, загараўшы, звыкла кладучы фарбы на эцюд. Пра набалелае, пра творчую і чалавечую самоту. А з сажалкі зырка паблісквала сонейка, размытае на эцюдзе халодным восеньскім адвячоркам...

Неяк на выставе твораў берасцейскіх мастакоў звярнула на сябе ўвагу немаладога веку жанчына. Яна толькі што, абсалютна не гандлюючыся, набыла адзін з пушчанскіх пейзажаў Міколы Маеўскага. На палатне, знізу ўверх, бегла залітая сонцам лясная сцяжынка.

— Даруйце, чаму менавіта гэтую карціну вы купілі? — пацікавіўся мой знаёмец-калекцыянер.

Жанчына неяк па-асабліваму светла ўсміхнулася празрыста-сонечнаму пейзажу і прамовіла як даўно вырашанае: — Я дакладна ведаю, што менавіта гэтай сцяжынкай я аднойчы пайду ў свой дзівосны, казачны лес...

На адной з такіх вераснёўскіх пушчанскіх сцяжынак спынілася Міколава сэрца...

Мікола Пракаповіч

«Гісторыі відавочна прысутныя»: «Дзеяслоў, № 91»

Пражыты і перажыты яшчэ адзін год. Па вялікім рахунку, нічым значна асаблівым для беларускай літаратуры ён не запомніўся.

Былі лакальныя творчыя ўдачы як у старэйшых пісьменнікаў, так і ў маладзейшага пакалення. Пры гэтым было выдадзена многа кніг, зроблена шмат папяровых і электронных публікацый, ладзіліся яркія імпрэзы і запамінальныя прэзентацыі… Словам, творчае жыццё працягвалася. Найбольш адметна праявілі сябе і былі прэміяльна адзначаны такія творцы, як Зміцер Бартосік, Наста Кудасава, Андрусь Горват ды Уладзімір Някляеў… Віншуем. І не пакідаем надзеі на лепшае, як для літаратуры і саміх літаратараў, так і для роднай мовы і самой беларускай нацыі. Тым часам выйшаў апошні (91-ы) нумар «Дзеяслова» за 2017 год.

Якраз напрыканцы адышоўшага года літаратурная грамадскасць адзначыла 70-годдзе знанага паэта **Алеся Разанава.** З гэтай нагоды часопіс прапануе сваім чытачам яго новыя запісы (зномы) пад агульнай назвай «Дзверы адчыняюцца і зачыняюцца». Многія філасафемы (можна і так іх назваць) *пазнаюцца* намі з досведу папярэдняй авангардна-пошукавай творчасці паэта. Найперш — адчувальнай прагай прамовіць яшчэ не казанае самім і пакуль яшчэ не сказанае іншымі. Творца хоча дамагчыся геніяльнай прастаты ў мастацкай выяве зямных рэчаў і сутнасці самога чалавека. Хоць вельмі часта полюсы разваг паэта змушаюць яго ўраўнаважваць шалі метафізічнага і духоўнага *(«Жыццё ў самаперазьызыходжанні, і чалавек істотны сваімі можнасцямі»)*. Аднак найбольш пэўную характарыстыку выдрукаваных зномаў можна зрабіць з такога запісу: *«Мова — тэкст, твор — кантэкст, у якім яна ўсялякі раз знаходзіць сваё адмысловае ўвасабленне. Колькі твораў — гэтулькі ўвасабленняў, колькі адмысловасцяў — гэтулькі творцаў»*. Хоць найбольш уразіла і шмат што праяснілa і патлумачыла гэта: *«Літаратура ёсць не таму, што яе чытаюць, а таму, што ёсць тое, што чытае яна, нават калі яе самую і не чытаюць»*.

Берасцеец **Алесь Паплаўскі** друкуе аповесць «Гульні з нулявымі сумамі». Па сутнасці, перад намі (у чым напрыканцы твора і прызнаецца аўтар) дзённікавыя нататкі вандроўнага самазаглыбленага чалавека. Сюжэт развіваецца марудна (ён турыстычна-падарожны) і трошкі занудна-медытацыйны. Герой аповесці разважае над сутнасцю чалавечай духоўнасці і грахоўнасцю свайго зямнога жыцця. Што ёсць Бог і што ёсць чалавек — іх узаемасувязь і неадлучнасць і ў граху, і ў святасці. (Па-за асноўным тэкстам прасочваецца параўнальны працэс будаўніцтва нацыянальных дзяржаў — Ізраіля і Беларусі.) Змест ды ідэйны пасыл душэўных сумненняў і ваганняў не прыводзяць да іх канчатковай гармоніі і годнага выхаду з таго ўнутранага катарсісу героя (самога пісьменніка). Цягам усяго твора чытачу (па замоўчванні) прапаноўваецца місія, можна сказаць, пракуратара (Понція Пілата) у сітуацыі разладу паміж героем твора і яго аўтарам.

Самалёт, на якім адлятае на Радзіму герой, церпіць катастрофу пры няўдалым прызямленні. Рукапіс трапляе да сына (тут свая маленькая драма), які і публікуе гэты, прапанаваны нам для прачытання, тэкст. Паразуменя з Вышэйшай сілаю так і не адбываецца. Таемнасць зямнога і паднебнага застаецца. Пожад разгадкі прыцягвае, страх адпрэчвае… На тым і трымаецца жыццё, прынамсі, яго вечнасць.

Празаік і паэт **Уладзімер Арлоў** гэтым разам выступае з баладай «Аркады Падуі», дзе ў вершаванай форме распавядае сучаснаму чытачу *«гісторыі відавочна прысутныя»*. Шуткуючы (спадзяюся, бяскрыўдна), можна сказаць, што гэтая балада У. Арлова ўбірае ў сябе ўсе балады В. Шніпа, бы акіян — рэкі, а калі сур'ёзна, то наогул усю гісторыю еўрапейскага асветніцтва. Яе (баладу) можна назваць і інтэлектуальнай, бо, дзякуючы гістарычнай эрудыцыі аўтара, тут спалучаны між сабою шмат імён і фактаў пэўнага часу (а да ўсяго, многа адсылаў і фрагментарных цытат). Усё завязана на Францішку Скарыне і ўсё ад яго, як ад жыватворнай крыніцы, расцякаецца далей па тэксце… Зрэшты, не так важна, пра што канкрэтна напісана балада, бо, у дадзеным выпадку, на маю думку, галоўнае — як. А напісана яна, апроч вышэй згаданага, з такой эратычнай жарсцю, што, шчыра кажучы, заканчваючы, ты ўжо забываеш пра пачатак хмельнага завабліваня ў ейны кантэкст… Галоўная выснова твора: усе мы, не зважаючы на нашу праміну-ласць ці наступнасць, пражываем зямное жыццё ў адным часе — вечнасці, і ўсе мы ўзаемазалежныя… Таму нават такія развяволеныя строфы, відаць, розлічаныя на прыцягальнасць, бы той яблык на дрэве пазнання, выклікаюць гарманічную асацыяцыю старажытнага і сучаснага:

на сцяне базілікі направа ад увахода
графіці з лічбамі
такое ты бачыў у Горадні на Каложы:
тут я і Нэлі саграшылі
пачалі 21.30 скончылі 22.15
відаць былі школьнікі
або настаўнік і вучаніца
або вучань і настаўніца
настаўніца анатоміі
як некалі ў цябе
твой сябар дзяліўся:
з настаўніцай займаемся 45 хвілін
з дацэнткай акадэмічную пáру
дацэнтка любіла казаць нам
сэкс дае адчуванне што мы жывыя

А слова дае нам адчуванне вечнасці. Пра што, пэўна, і хацеў сказаць аўтар балады.

Урывак з рамана «Libido» **Іллі Сіна** ўяўляе сабой псіхалагічна скроены пласт жыцця пакалення, народжанага перабудовай. Той перыяд яшчэ можна назваць пластмасавым жыццём. Жанчына, што стала сексуальнай цацкай (прыладай) для задавальнення іншых, у рэшце рэшт, хоча сама знайсці для сябе адзінага Іншага. І ўвесь гэты постсавецкі вэрхал і тлум, што забірае яе дарэшты, у выніку не пакідае ёй нічога, апроч мройлівага пожаду немагчымага… Адчуваецца, што думкамі і паводзінамі жанчыны кіруе аўтар, і гэта найвярнейшы знак таго, што яе крозы пра Іншага і пра іншае не завяршаюць рэальнасцю. Але, каб ведаць тое пэўна, трэба прачытаць твор цалкам.

Галіна Каржанеўская піша свой час адпаведнымі словамі, якія намагаюцца той час засведчыць і зберагчы, хоць ясная рэч:

Ля парога былога
Красамоўна, як плач,
Застануцца сіроты —
Дзівасіл ды касач.

Заключная публікацыя ўрыўкаў з рамана **Леаніда Левановіча** «Міленіум» — гэта пераважна дзённікавыя запісы 2000 года падчас паездкі аўтара (героя рамана) да дзяцей у ЗША. Ад амерыканскага прагматычнага дабрабыту да вяртання ў беларускую сціплую, але душэўна цёплую дабрадзейнасць (радавацца чужому –любіць сваё). Чытанне на аматара. Вобраз Бравусава нечым аддалена нагадвае помнага героя Вапшчэтку з «Сачынення на вольную тэму» Анатоля Кудраўца, але не больш за тое.



Цікава было прачытаць такое: *«Знайшоў словы ў падтрымку сваёй пісаніны. Часам я лавіў сябе на думцы, што пішу коратка, суха. Дык вось, зямляк Фёдар Міхайлавіч зазначае: «Всего лучше иногда рассказчику ограничиваться простым изложением событий». А далей вось так: «К тому же всякие записи очевидцев драгоценность. Даже кто бы ни был очевидец. Не правда ли?» Так, Фёдар Міхайлавіч, праўда! Я і ёсць той самы «очевидец», які жыве на мяжы тысячагоддзяў і штодня крэмзае паперу. Можа, і недарэмна? «Бремя моих сомнений стало легче». Аднадумца ў мяне геніяльны, прызнаны ўсім светам аўтарытэт»*.

Эротыка на мяжы жыцця і смерці. Прыкладна так можна вызначыць апавяданне **Давіда Шульмана** «Каця і Валодзя». Як на мяне, то менавіта падобнай чытэльнай прозы бракуе нашай сучаснай літаратуры. Аўтар жыве ў Ізраілі. Ён не саромеецца пісаць простыя, але зразумелыя рэчы: *«Я ведаю пяць моваў, але зараз мы будзем «размаўляць» яшчэ на адной, на любімай: на мове сэксу.»*

Вершы **Юркі Голуба** ярка метафарычныя, ігрыста-хмельныя, рытмічна-выбіўныя, бездакорнай рыфмай знітаваныя. Класічны ўзор традыцыйнай паэзіі.

Адзін з найбольш таленавітых сучасных паэтаў берасцейшчыны **Алесь Каско,** на жаль, не дачакаўся публікацыі сваіх вершаў. Ён цяжка і невылечна хварэў, але яшчэ паспеў спарадкаваць і адаслаць у рэдакцыю сваю перадсмяротную паэтычную нізку, якую назваў «Напрыканцы будучыні». Цудоўны творца адышоў у лепшы свет, пакінуўшы чытачам свой адмысловы творчы плён. Спадзяюся, што ўсё створанае паэтам збярэцца, выдасца, даследуецца і ўвекавечыцца. А гэта — нам на адвітанне:

Пасля мяне, трава, расці,
сцяблінка, набірайся сілы;
скрозь час глухі і рух бяскрылы,
скрозь ледзь прагрэты жвір магілы
пасля мяне, трава, расці.
Свет гэты мілы ці нямілы,
мне не ўсвядоміць пры жыцці;
для тых, каму пазней прыйсці,
пасля мяне, трава, расці,
сцяблінка, набірайся сілы!

Геніяльныя радкі, як на маё адчуванне. Своеасаблівы духоўны запавет нашчадкам.

Прапануюцца ўвазе чытачоў тры апавяданні **Алеся Ветаха** (Бельскага), напісаныя ў добротным старым стылі класічнай нацыянальнай прозы. Ёсць злабадзённыя сюжэты на сучасную тэму з маральна-духоўнымі высновамі. Расповеды чытэльныя, але занадта стэнаграфічныя. Прыкладна так: *«Навокал шмат таго, што бянтэжыць і пярэчыць тваёму светаўяўленню. Чалавек па-ранейшаму ідзе супраць чалавечнасці, памяці, свайго сумлення, жыве так, як лічыць патрэбным. Магчыма, не варта крыўдаваць, сердаваць, гневацца, а трэба імкнуцца даравáць… Вядома, гэта цяжка, бо хочацца справядлівасці, сустракаць узаемаразуменне, падтрымку, спагаду. У жыцці не ўсё атрымоўваецца так, як нам хочацца ды жадаецца. Ды, галоўнае, усё ж верыць у лепшую будучыню. Так, як у гэта верылі нашы бацькі, дзяды і продкі. І тады прыйдзе новы дзень, пачнецца сустрэчны рух…»*

Тыя ж, хто прагне «забугорнага», маюць магчымасць пазнаёміцца з выбітнымі вершамі ірландскага паэта **Уільяма Батлера Ейтса** (нобелеўскага лаўрэата) у перакладах Андрэя Хадановіча.

Друкуюцца таксама лепшыя **пераклады пераможцаў конкурсу «Эксклібрыс»:** Іааны Владыкі *(успаміны Тэрэзы Тышыньскай),* Алеся Емяльянава *(вершы Уістана Х'ю Одэна, Нормана Маккейга, Ленгстана Х'юза, Адама Загаеўскага, Юльяна Тувіма, Ганны Свіршчыньскай),* Сяргея Матыркі *(урывак з рамана «Вялікі Гэтсбі» Ф. Скота Фіцджэральда),* Надзеі Квасняк *(паэзія Юльяна Тувіма),* Яўгеніі Лабохі *(проза Гектара Х'ю Манро).*

Публікуецца даволі арыгінальная п'еса ў двух дзеях **Сяргея Кавалёва** «Камедыя Юдзіфі».

У рубрыцы «Словы» — гутарка Л. Галубовіча («Вяртаючыся да пачатку») з найстарэйшай і выдатнай нашай пісьменніцай **Аленай Васілевіч,** прыўрочаная да яе слаўнага 95-годдзя.

Побач — цікавы і арыгінальны літаратурна-гістарычны артыкул **Вячаслава Рагойшы** пра творчасць Францыска Скарыны «Людем посполитым к доброму научению».

Публікуюцца мемуары вядомага бібліёграфа **Юліі Бібіла** «…Прысвяціць сябе справе блізкай, харошай!» з пазнавальнай і цёплай прадмовай Таццяны Кекелевай і Арсеня Ліса.

Таленавіты слонімскі крытык, паэт і краязнаўца **Сяргей Чыгрын** распавядае пра жыццё і творчы лёс малавядомых да гэтай пары заходнебеларускіх паэтаў Язэпа Крыгі і Маладога Дубка (публікацыя падаецца з некаторымі вершамі згаданых аўтараў).

У артыкуле «Шлях мой самотны» літаратуразнаўца **Вольга Клімавец** звяртаецца да некаторых неразгаданых ці пакінутых па-за ўвагай крытыкаў лёсавых вобразаў беларускага пісьменніка ў рамане Уладзіслава Рубанава «Не аднойчы забіты».

Друкуецца рэцэнзія **Леаніда Галубовіча** («Пад крылом анёла-ахоўніка») на кнігу Вінцэся Мудрова «Забойца анёла».

Рубрыкай **«Дзеяпіс»** з кароткімі анатацыямі новых выданняў нумар закрываецца.

Чытайце на здароўе — і, па магчымасці, духоўна ўзбагачайцеся.

ЛеГал

Прэмія «Коста»

Як паведаміў сайт аргкамітэта прэміі «Costa Book Award», брытанскую паэтку, пісьменніцу і аўтара дзіцячых кніг Хелен Данмор пасмяротна ўганаравалі літаратурнай прэміяй «Коста» за лепшы паэтычны твор 2017 года.

Узнагародай адзначылі яе зборнік вершаў «Inside the Wave», які яна напісала ў апошнія тыдні свайго жыцця. Х. Данмор, у якой дыягнаставалі анкалагічнае захворванне, памерла 5 чэрвеня мінулага года.

Лаўрэатам прэміі «Коста» за лепшы раман назвалі Йона Макгрэгора з яго кнігай «Reservoir 13». Пераможцай у катэгорыі «Лепшы дэбютны раман» стала Гейл Ханіман з творам «Eleanor Oliphant Is Completely Fine». Кніга Рэбекі Стот «In the Days of Rain» атрымала прэмію сярод біяграфічных твораў, а лепшым аўтарам дзіцячых кніг журы назвала Кэтрын Рандэл (кніга «The Explorers»).

Такім чынам, чацвёра з пяці лаўрэатаў прэміі ў катэгорыях сталі жанчыны. Лаўрэаты ў катэгорыях «Раман», «Лепшы дэбютны раман», «Біяграфія», «Дзіцячая літаратура» і «Паэзія» атрымаюць па 5 тысячаў фунтаў стэрлінгаў кожны, а ўладальніку галоўнай узнагароды — «Кніга года» — уручаць 30 тысячаў.

Галоўную ўзнагароду сярод прэмій «Коста» — за найлепшую кнігу года — прысудзяць 30 студзеня. Прэтэндэнты — усе пяцёра згаданых аўтараў, паколькі намінавацъ на ўзнагароду могуць толькі пераможцаў у асобных катэгорыях. І, калі перамога дастанецца Х. Данмор, то яна стане другім у гісторыі пасмяротным лаўрэатам галоўнай прэміі пасля паэта Тэда Х'юза (1930–1998).

Літаратурную прэмію «Коста», якая да 2006 года называлася Уітбрэдаўскай прэміяй (Whitbread Book Award), штогод прысуджаюць ужо на працягу 47 гадоў — з 1971 года. Прэтэндаваць на яе могуць пісьменнікі Брытанскіх выспаў (Вялікабрытаніі і Ірландыі). Прэмію, якая прысуджаецца Асацыяцыяй кнігагандляроў Вялікабрытаніі, лічаць адной з найбольш аўтарытэтных узнагарод англамоўнай літаратуры.

Забарона казак пра рускіх волатаў ва Украіне

Кнігі «Илья Муромец и Соловей-разбойник: сказки о русских богатырях» і «Богатырские русские сказки» забаронены да продажу ва Украіне згодна з пастановай Нацыянальнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні.

Пра гэта 5 снежня паведаміла газета «Коммерсантъ».

Прычынай забароны стала тое, што абедзве кнігі выдаюцца ў Расіі. Суразмоўца газеты ва ўкраінскім урадзе падкрэсліў, што Кіеў нічога не мае супраць саміх былінных персанажаў, у тым ліку Ільі Мурамца. «Яго мошчы ляжаць у пячорах Кіева-Пячэрскай лаўры, кнігі пра яго публікуюць украінскія выдавецтвы, і няма неабходнасці ўвозіць іх з Расіі», — падкрэсліў ён.

За год ва Украіне забаранілі ўвозіць 19 расійскіх выданняў, сярод іх два творы пісьменніка Барыса Акуніна.

Парадак канфіскацыі кніг, выдадзеных у Расіі ды ўвезеных у краіну без дазволу, уступіў у сілу ў траўні. Забарона не распаўсюджваецца на выданні, якія правозяць у ручной паклажы або багажы, аднак іх колькасць не павінна перавышаць 10 асобнікаў.

390 гадоў Шарлю Пэро

390 гадоў таму нарадзіўся Шарль Пэро — французскі пісьменнік, паэт, публіцыст, адвакат, акадэмік.



У гісторыі літаратуры яго ведаюць як галоўнага ідэолага руху «новых» у «Спрэчцы аб старажытных і новых» — палеміцы Французскай акадэміі вакол мастацтва антычнасці і XVII стагоддзя. На думку «новых», мастацтва стагоддзя Людовіка нашмат перасягнула антычнае і павінна было развівацца і далей, а ўяўленню аб нязменным ідэале яны супрацьпастаўлялі ідэю паступальнага прагрэсу мастацтва.

Шарль Пэро быў «пладавітым» літаратарам, аднак усе яго тэксты неўзабаве былі забытыя, а вось «Казкі матухны гускі, або Гісторыі і казкі былых часоў з павучаннямі», апублікаваныя ў 1697 годзе, праславілі яго на ўвесь свет і на ўсе часы.

Першапачаткова 69-гадовы акадэмік выдаў казкі пад імем свайго сына — Перо д'Арманкура, паспрабаваўшы такім чынам зберагчы сваю літаратурную рэпутацыю ад абвінавачванняў у працы з «нізкім» жанрам казкі, якой яна ў той час лічылася.

Зборнік складаўся з 8 літаратурна апрацаваных народных казак: «Папялушка», «Кот у ботах», «Чырвоны Каптурок», «Хлопчык-з-пальчык», «Падарункі феі», «Сіняя барада» і інш. Кожная з іх абавязкова ўтрымлівала мараль.

Зборнік казак меў ашаламляльны поспех і спарадзіў сярод французскай арыстакратыі XVII стагоддзя моду на казкі. Дзякуючы аўтару народная казка была ўведзена ў сістэму жанраў «высокай» літаратуры, а яго казкі палюбілі ва ўсім свеце.

Піраты-чытачы XVIII стагоддзя

Дэпартамент прыродных і культурных багаццяў Паўночнай Караліны паведаміў, што ў адной з гарматаў флагманскага карабля знакамітага пірата Чорная Барада «Помста каралевы Ганны» амерыканскімі навукоўцамі было выяўлена 16 фрагментаў кніг, якія чыталі піраты XVIII стагоддзя.



У 1717 годзе пірат Эдвард Драмонд (Ціч) па мянушцы «Чорная Барада» захапіў французскі карабель «Канкорд», зрабіў сваім флагманам, перапназваўшы яго ў «Помста каралевы Ганны». У чэрвені 1718 года карабель сеў на мель ля берагоў Паўночнай Караліны.

У 1996 годзе карабель быў знойдзены, і з тых часоў даследчыкі паступова ўздымалі з дна часткі шалёўкі, такелажа ды іншыя фрагменты. Навукоўцы знайшлі ў паднятай са дна мора гармаце вільготны камяк паперы. Самы буйны з іх дасягаў памеру ў чвэрць друкарскага аркуша (каля 24,15×30,5 см). Звычайна папера вельмі хутка раскладаецца пад вадой, але ў гэтым выпадку яна захавалася!

Было зроблена яшчэ адно адкрыццё: на некаторых фрагментах паперы ўсё яшчэ быў друкаваны тэкст, хоць прачытвалася толькі некалькі слоў. Затым задача заключалася не толькі ў тым, каб захаваць папяровыя фрагменты, але і вызначыць, адкуль яны.

У выніку доўгіх месяцаў карпатлівай працы даследчыкам удалося высвеціць, што знойдзеныя артэфакты ўяўляюць фрагменты першага выдання кнігі Эдварда Кука «Падарожжа да Паўднёвага мора і вакол Зямлі, здзейсненае ў 1708, 1709, 1710 і 1711 гадах». У ёй аўтар апісвае плаванне двух караблёў — «Герцага» і «Герцагіні» — пад агульным камандаваннем капітана Вудса Роджэрса, апублікаваў рэпартаж пра сваё падарожжа.

Кнігі пра падарожжы былі надзвычай папулярныя ў XVII–XVIII стагоддзях. У кнігах Роджэрса і Кука апісана выратаванне з бязлюднага вострава марака Аляксандра Селькірка, які пражыў 4 гады на незаселенай выспе і стаў прататыпам Рабінзона Круза, кнігу пра якога Даніэль Дэфо апублікаваў у 1719 годзе.

У гістарычных архівах ёсць некалькі спасылак на кнігі на борце караблёў у флоце Чорнай Барады, але няма ніякіх канкрэтных назваў, і гэтая ўнікальная знаходка з'яўляецца першым археалагічным сведчаннем іх прысутнасці.

Аднак ці чытаў сам Чорная Барада гэтую кнігу насамрэч — сказаць немагчыма...

Фінансава найпаспяховыя літаратары

Сёння аўтары атрымліваюць грошы за сцэнарыі фільмаў, а продажы кніг звычайна складаюць толькі невялікую частку іх даходаў. Аднак сайт Інфаграфіка Visualistan сабраў інфармацыю пра некаторых найбольш фінансава паспяховых літаратараў — згодна з іх агульным «слоўным» даходам за год.

Уаснове падлікаў — колькі каштавала адно слова аўтара. Дадзеныя пра самых высокааплатных пісьменнікаў са спісу «Forbes» лічылі ў наступных «катэгорыях»: чысты прыбытак аўтара, заробак пісьменніка за год, наклад прададзеных кніг, апублікаваных у мінулым годзе, колькасць слоў у іх і прыкладны кошт кожнага слова.

Атрымаліся неверагодныя лічбы! Можна ўявіць сабе зароблены сотні даляраў за кожнае напісанае слова? Хоць свет ужо жыве не так, як у часы Дзікенса і Льва Талстога, усё яшчэ даволі цікава думаць, што кожны раз, калі клавіятура набірае новую камбінацыю літар, Стывен Кінг атрымлівае 67,20 даляраў ЗША ($).

На першым месцы — Дж.К. Роўлінг. Кошт аднаго яе слова ў 2017 годзе склаў 957,66 даляраў ЗША. Усяго зароблена $650 мільёнаў. Зароблена ў 2017-м — $95 мільёнаў. Агульны наклад кніг — 400 мільёнаў асобнікаў.

Другое месца займае Джэймс Патэрсон. Кошт аднаго яго слова ў 2017 годзе — $278,41. Усяго зароблена $700 мільёнаў (у 2017-м — $87 мільёнаў). Агульны наклад кніг — 300 мільёнаў асобнікаў. У 2017 годзе напісана: 312 480 слоў...

«Бронза» — у Джэфа Кіні. Кошт аднаго яго слова ў 2017 годзе быў $302,42. Усяго зароблена $70 мільёнаў. У 2017-м — $21 мільён. Агульны наклад кніг — 194 мільёнаў асобнікаў. (У 2017 годзе ім напісана 69 440 слоў).

Дэн Браўн — на чацвёртым месцы. Кошт яго аднаго слова ў 2017 годзе — $144,93. Усяго ім зароблена $178 мільёнаў (у 2017-м — $20 мільёнаў). Агульны наклад кніг — 200 мільёнаў асобнікаў.

Пятае месца па фінансавай паспяховасці — у Стывена Кінга. Кошт яго аднаго слова ў 2017 годзе — $67,2. Усяго ж ім зароблена літаратурнай працай $400 мільёнаў... (У 2017-м– $15 мільёнаў.)

Джон Грышэм — на шостым месцы. Кошт аднаго яго слова ў 2017 годзе быў таксама $67,2. Усяго ён атрымаў $220 мільёнаў.

На сёмым месцы Нара Робертс (кошт аднаго слова ў 2017 годзе — $35,28). Усяго ж зароблена $340 мільёнаў. У 2017 годзе — $14 мільёнаў. Агульны наклад кніг — 400 мільёнаў асобнікаў. Усіх выдадзеных кніг — 213. У 2017 годзе напісана 396 800 слоў...

Пола Хокінс — восьмая. Кошт аднаго слова ў 2017 годзе — $119,13. Зароблена ў 2017 годзе $13 мільёнаў.

На дзявятым месцы — Э.Л. Джэймс. Кошт аднаго слова ў 2017 годзе — $66,24. Усяго зароблена $ 60 мільёнаў. У 2017-м — $11,5 мільёна. Агульны наклад кніг 125 млн асобнікаў.

Завяршае «дзясятку» найзаможных літаратараў Рык Рыярдан. Кошт аднаго ягонага слова — $33,60. Усяго ён зарабіў $35 мільёнаў (з іх у 2017-м — $11 мільёнаў)...

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by